Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №122 (28486)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## ЗВЕРКА ГАДЗІННІКАЎ

### Прэзідэнт наведае Расію з рабочым візітам

Аляксандр Лукашэнка 29—30 чэрвеня зробіць рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю, дзе прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета (ВДС) Саюзнай дзяржавы і IV Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Як паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта, на пасяджэнні ВДС плануецца абмеркаваць найважнейшыя пытанні беларуска-расійскага ўзаемадзеяння. Адна з цэнтральных тэм парадку дня — вынікі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі за 2016 год.

Плануецца таксама прааналізаваць выкананне Праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі, разгледзець ход выканання Прыярытэтных кірункаў і першачарговых задач далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву.

Чакаецца, што перад пасяджэннем Вышэйшага дзяржаўнага савета адбудзецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, на якой бакі абмяркуюць найбольш важныя пытанні ўзаемадзеяння краін як на двухбаковай аснове, так і ў інтэграцыйных фарматах.

На 30 чэрвеня таксама запланаваны сумесны ўдзел кіраўнікоў дзяржаў у пленарным пасяджэнні IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на тэму «Вектары інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ганна МУХА, начальнік аддзела маркетынгу і якасці турыстычных паслуг дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«З 12 лютага бязвізавым уездам у Беларусь скарысталіся каля 30 тысяч турыстаў. З Германіі ў Беларусь без візы прыехала каля 4000 чалавек, таксама часта карыстаюцца магчымасцю бязвізавага ўезду палякі і італьянцы. Амерыканцы і канадцы аддаюць перавагу камбінаваным турам, напрыклад, праводзяць чатыры дні ў Беларусі, далей едуць у Польшчу або іншыя краіны Еўропы. Нагадаем, 12 лютага ў Беларусі запрацаваў бязвізавы рэжым для грамадзян 80 краін».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9343 | ▲ |
| Еўра | 2,1987 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Святкуем

# З днём нараджэння, Магілёў!






Фота БЕЛТА.

**Свае віншаванні магіляўчанам накіраваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт адзначыў, што горад шмат чаго робіць для прымнажэння культурных і духоўных традыцый. Сёння Магілёў — гэта сучасны індустрыяльны, навуковы і культурны цэнтр, добра вядомы за межамі Беларусі.**

СТАР. 2

■ Ёсць ідэя!

# Па шляху Напалеона

### Ці не выкарыстаць у нашым турызме «імператарскую» тэму?

**Гэты год багаты на юбілейныя даты, але адна з іх на фоне круглых лічбаў можа застацца незаўважанай. Між іншым, менавіта на ёй можна «сыграць» пры распрацоўцы новых маршрутаў, якія будуць прывабнымі для турыстаў, што наведаюць нашу краіну ў бязвізавым рэжыме. Нельга забывацца, што на тэрыторыі Беларусі праходзілі бітвы, якія былі вызначальнымі ў лёсах Расіі і Еўропы. Менавіта нашы землі, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, сталі арэнай баявых дзеянняў у вайне 1812 года.**

## Што паказаць?

На тэрыторыі Беларусі захавалася больш за 80 аб'ектаў, звязаных з вайной 1812 года, прычым найбольшая колькасць іх знаходзіцца на Віцебшчыне.

Гэта і грандыёзныя фартыфікацыйныя збудаванні, і дзясяткі помнікаў розных часоў, усталяваных на месцы падзей. Некаторыя з іх — у добрым стане, асобныя маюць патрэбу ў рэстаўрацыі. Таксама можна вызначыцца з тым, якія аб'екты варта аднавіць, каб выкарыстаць іх ва ўжо існуючых турыстычных маршрутах.

А яшчэ можна распрацаваць новыя экскурсіі — тэматычныя, прысвечаныя менавіта падзеям вайны 1812 года. Прычым, раскрываць перад турыстамі гэту тэму можна па-рознаму. Напрыклад, ствараць маршруты, у якіх будзе расказвацца пра фартыфікацыйныя збудаванні, якіх багата з'явілася на нашай зямлі напярэдадні і ў час вайны 1812 года. Найбольш цікавыя аб'екты — Бабруйская крэпасць і Барысаўскі тэт-дэ-пон. Праўда, сёння яны знаходзяцца ў занядбаным стане, але, калі іх давесці да ладу, гэта будзе цікавая кропка на турыстычнай карце.

Асабліва прывабнымі падаюцца аб'екты, якія можна задзейнічаць у міжнародных маршрутах. Напрыклад, такім магло стаць пазнавальнае падарожжа, якое праходзіла б на тэрыторыі трох краін — Латвіі (Рыга, Даўгаўпілс), Беларусі (Верхнядзвінск, Барысаў, Бабруйск) і Украіны (Кіеў). Менавіта тут знаходзяцца добра захаваныя аб'екты ваеннай архітэктуры. Прычым гэты маршрут можа быць і водным — праходзіць праз Даўгаву, Беразіну і Дняпро.

СТАР. 4

■ Жыллё маё

# ЯК УПРЫГОЖЫЦЬ І АБАРАНІЦЬ ДВАРЫ

**Платныя аўтастаянкі ў дварах жылых дамоў, шлагбаум як сродак абароны сям'і і паркоўкі для веласіпедаў каля пад'езда. Пра гэтыя і іншыя змены і пытанні ў жыллёва-камунальным жыцці краіны расказалі спецыялісты.**

## Хто плаціць за кветнікі і святло каля дома

**Намеснік генеральнага дырэктара ДА «Гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіна ГІЛЕВІЧ** заўважае, што ў апошнія гады актыўнасць удзелу жыхароў у добраўпарадкаванні і ўпрыгожванні двароў расце. Свядомая пазіцыя праяўляецца нават у арандатараў памяшканняў у жылых дамах. А сёлета ў многіх грамадзян з'яўляецца жаданне будаваць у дварах велапаркоўкі:

— Калі сілы, што прыкладваюць самі жыхары на стварэнне кветнікаў каля пад'ездаў і іх догляд, перавесці ў грашовыя сродкі — калі б кветкі пасадзілі мы і даглядалі іх, — то гэтая сума ў некалькі разоў перавышала б выдаткі, якія пералічваюцца на разліковыя рахункі для закупкі, скажам, дзіцячага абсталявання.

Пералік работ па добраўпарадкаванні і ўтрыманні прыдамавых тэрыторый, якія павінны забяспечваць мясцовыя выканкамы, вызначаны Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі (Мінжылкамгасам). Гэта ўтрыманне і рамонт вулічна-дарожнай сеткі, дзіцячых гульнявых,



гаспадарчых і спартыўных пляцовак, пясочніц, пляцовак для збору цвёрдых камунальных адходаў, догляд аб'ектаў расліннага свету, вонкавае асвятленне.

Тлумачыць **Алена НОВІКАВА, галоўны спецыяліст сектара па надзвычайных сітуацыях Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі:**

СТАР. 4

■ З нагоды

# АДЛЕГЛАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА


Фота БЕЛТА.

**На IV Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адкрываецца 29 чэрвеня ў Маскве, традыцыйна прыязджаюць прадстаўнікі далёкіх рэгіёнаў краіны-суседкі. Паміж імі і Беларуссю тысячы кіламетраў. Але гэта не перашкаджае нам гандляваць, рабіць сумесную прадукцыю і разам удзельнічаць у навуковых распрацоўках. Як парламенты дзвюх краін дапамагаюць скараціць шлях у тысячы кіламетраў, мы распыталі старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА.**

Мінск і Новасібірск — гарады-пабрацімы, прывёў прыклад сенатар. Паміж імі больш за чатыры тысячы кіламетраў. Тым не менш гарады актыўна абменьваюцца афіцыйнымі візітамі, і беларускі экспарт у Новасібірскую вобласць расце. Нашы прадпрыемствы вязуць туды прадукты харчавання, вылічальныя машыны, трактары, мэблю, абутак... Гэта сведчыць пра тое, што ў Сібіры беларуская прадукцыя запатрабаваная. Развіваюцца сувязі і ў навуковай сферы, беларускія прадпрыемствы ўдзельнічаюць у сумесных вытворчых праграмах. «На гэтым прыкладзе можна паказаць, што аналагічныя падыходы ёсць і да іншых рэгіёнаў. Дасягнуты дамоўленасці пра пашырэнне інавацыйнага супрацоўніцтва», — адзначае Уладзімір Панцюхоў. Дарэчы пра інавацыі: у Беларусі вырастоўваюць новасібірскія нанаматэрыялы, а ў Расію мы пастаўляем матэрыялы на аснове шкловалакна. Сумесная праца вучоных поўнасцю адпавядае сёлетняй тэме форуму — узаемадзеянне ў сферы высокіх тэхналогій.

Пад увагай заканадаўцаў застаецца і прамкааперацыя. На мінулым форуме была створана экспертная група Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, якой прапанавалі разгледзець прамысловую палітыку Саюзнай дзяржавы. Сёлета на пасяджэнні гэтай камісіі ў Маскве будзе праведзены аналіз зробленага ў гарманізацыі заканадаўчай базы Беларусі і Расіі ў прамысловай сферы. «Мы будзем гаварыць пра адрозненне эканамічных сістэм. У нас вырашальная роля ў эканоміцы належыць дзяржаве, а ў Расіі — прыватнаму бізнесу», — тлумачыць Уладзімір Панцюхоў. Тым не менш патэнцыял у стварэнні сумесных гаспадарчых структур і рэалізацыі інтэграцыйных праектаў захоўваецца. Нарматыўная база адрозніваецца тым, што ў Беларусі няма закона аб прамысловай палітыцы, а ў Расіі такі ёсць. Аналагічная беларуская канцэпцыя ўжо створана, у планах — распрацоўка законапраекта. Скаардынаванасць прамысловай палітыкі дапамагае пазбегнуць дублявання праектаў, пра што таксама будуць гаварыць на пасяджэнні ў Маскве. Уладзімір Панцюхоў прапаноўвае правесці экспертызу заканадаўчых баз Беларусі і Расіі наконт іх гарманізацыі. Гэта дапаможа ацаніць, што зроблена за апошнія дваццаць гадоў і дзе неабходна дапрацоўка.

Заўсёды важнай тэмай для ўлад застаецца прыцягненне інвестыцый у рэгіёны. Над гэтым працаваць неабходна і бізнесу, і мясцовым органам кіравання. «Мы павінны зрабіць усё, каб любыя змены, звязаныя з інвестыцыйным заканадаўствам, рабілі нашу краіну прывабнай, каб інвестар прыходзіў і быў упэўнены: тут ён атрымае прыбытак», — падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. На жаль, сёння па некаторых параметрах мы не дацягваем, але неабходныя падыходы выпрацаваны — і ў нашых магчымасцях змяніць сітуацыю.

На Форуме рэгіёнаў, як заўсёды, плануецца падпісаць шэраг камерцыйных кантрактаў. Згодна з прагнозамі, сёлета Гродзенская і Магілёўская вобласці павялічаць іх колькасць у разы, што сведчыць пра зацікаўленасць і прадметную работу з абодвух бакоў: беларускага і расійскага. Колькасць кантрактаў расце і сумарна. Як лічыць Уладзімір Панцюхоў, гэта сведчыць аб правільнасці крокаў і разуменні адно аднаго. Запыт на супрацоўніцтва ў такім фармаце існуе і з боку іншых краін. У плане работы Савета Рэспублікі на другое паўгоддзе 2017-га распрацаваць канцэпцыю аналагічнага беларуска-польскага Форуму рэгіёнаў.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# З днём нараджэння, Магілёў!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гулянні з нагоды 750-годдзя Магілёва праходзяць з 28 чэрвеня па 3 ліпеня на 30 пляцоўках горада. Учора адбылася ўшанаванне ўладальнікаў спецыяльнай прэміі Магілёўскага гарвыканкама «Дасягненне». Сярод яе лаўрэатаў дырэктар навукова-вытворчага прадпрыемства «Тэхналіт» Аляксандр Бадзяка, галоўны рэдактар інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Святлана Шутава, усяго — 17 прадстаўнікоў з розных сфер дзейнасці. Гэтую ж прэмію гарвыканкам уручыў і кіраўніку ўправы раёна Сакаліная Гара горада Масквы Аляксандру Аксёнаву.

Дадатковую атмасферу свята ў горадзе стварае міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа», у рамках якога праходзіць навукова-практычная канферэнцыя «Магілёў: мінулае і сучаснасць», адбываюцца канцэрты духоўнай музыкі, свята звона. Уражальнай падзеяй стане маштабнае тэатралізаванае шэсце, прысвечанае гісторыі горада. На мове музыкі і мастацкіх вобразаў яно распавядзе пра 750-гадовы шлях развіцця Магілёва. Магілёўчан і гасцей горада ў гэтыя святочныя дні чакаюць шматлікія канцэрты, выставы, кірмашы, спартыўныя мерапрыемствы. 1 і 2 ліпеня на беразе Дняпра адбудзецца арт-праект «Вялікая бард-рыбалка ў Магілёве» і гарадское маладзёжнае свята «Магілёў — горад дабра». Тут пройдуць спаборніцтвы па рыбнай лоўлі, пляжным футболе і валейболе, адбудзецца «Свята лазні», конкурс па прыгатаванні «Дняпроўскай юшкі», канцэртныя праграмы бардаўскай песні, айчынных калектываў і выканаўцаў. Прыемны падарунак абласному цэнтру да юбілею зрабіў горад Чанша кітайскай правінцыі Хунань. Кітайскі бок узяў на сябе выдаткі па дастаўцы і запуску 30-хвіліннага феерверку. Гэта будзе своеасаблівы фільм на небасхіле, складзены з чатырох частак. Яго дэманстрацыю забяспечаць 30 чалавек тэхнічнага персаналу.

Дарэчы, гэта не адзіны падарунак ад кітайцаў. 27 чэрвеня ў Магілёве ўрачыста здалі ў эксплуатацыю першы ў рэгіёне сацыяльны дом, пабудаваны за кошт кітайскага капіталу. Жыць у ім будуць магілёўчане, якія выхоўваліся без апекі бацькоў, сем'і, якія маюць дзяцей-інвалідаў, шматдзетныя і іншыя грамадзяне з ліку сацыяльна неабароненых катэгорый.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### Толькі лічбы

**68,4 мільёна долараў ЗША**, або 136,8% (заданне 118,3%) да ўзроўню 2015 года інвеставаў летась Магілёў у асноўны капітал за кошт замежных крыніц.

**2,9 мільярда рублёў** (117,7% да ўзроўню 2015 года) склаў у 2016 годзе аб'ём прамысловай вытворчасці горада.

**24,9 мільёна долараў ЗША** (108,2% да ўзроўню 2015 года) склаў экспарт паслуг без уліку арганізацый рэспубліканскай формы ўласнасці.

**704,7 рубля** склала намінальная сярэднямесячная зарплата за студзень-красавік 2017 года

### Да ведама

**За мужнасць і стойкасць**, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Магілёў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**Летась Магілёў быў прызнаны пераможцам у намінацыі «Лепшы абласны цэнтр»** рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры ў Год культуры».

■ Тры пытанні да ўлады

# Панарамныя ліфты і будынкі з беларускім арнаментам

## Мэр Магілёва Уладзімір Цумараў — пра тое, як мяняецца знешні выгляд горада


Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

**Тэма архітэктурна-планіровачнага развіцця Магілёва летась часта станавілася прадметам для размоў, у тым ліку і на ўзроўні Прэзідэнта. Не дзіўна, што яна знаходзіцца на пастаянным кантролі ў мэра Магілёва Уладзіміра Цумарава. Апошнім часам горад прыкметна папрыгажэў. Дастаткова згадаць сучасныя будынкі маладзёжнага мікрараёна «Спадарожнік», абноўлены мост цераз Днепр са зручнай транспартнай развязкай, добраўпарадкаванне парку ў Падміколлі. Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Цумараў расказаў нашай газеце, што робіцца для таго, каб горад стаў яшчэ больш зручным для жыхароў і больш прывабным для турыстаў.**

***— Уладзімір Міхайлавіч, сёлета кіраўніком дзяржавы была зацверджана новая рэдакцыя Генплана развіцця горада да 2025 года. Што робіцца для рэалізацыі гэтай праграмы?***

— У найбліжэйшыя гады прыярытэт захаваецца за добраўпарадкаваннем цэнтральнай часткі Магілёва, мікрараёнаў Казіміраўка, Спадарожнік, Сонечны і іншых. Шмат увагі ўдзяляецца рэканструкцыі Мінскай шашы — галоўнай дарожнай магістралі нашага горада. Распрацавана праектная дакументацыя па капрамонце з мадэрнізацыяй участка гэтай дарогі ад вуліцы Б. Бірулі да вёскі Прысна з узвядзеннем аркі, так званай уязной брамы ў горад. Распачата работа па дэкаратыўна-мастацкім афармленні фасадаў жылых дамоў у Казіміраўцы і Спадарожніку. Некалькі будынкаў, напрыклад, ужо аформлены ў традыцыйным беларускім стылі з нанясеннем арнаменту. У хуткім часе «заговорыць» фасад аднаго з магілёўскіх універсітэтаў — МДУ імя А. Куляшова, дзе таксама на тарцовым баку з'явіцца малюнак. Вядзецца распрацоўка пашпарта аздаблення фасада прадпрыемства «Абутак» па вуліцы Якубоўскага, якая з'яўляецца працягам Мінскай шашы. А на будынку дыягнастычнага цэнтра, які размешчаны на цэнтральнай вуліцы горада Першамайскай, праектнай дакументацыяй прадугледжаны панарамныя ліфты.

***— Магілёў расце і яго знешняму выгляду ўжо не імпануюць тыя дамы сядзібнага тыпу, якія размешчаны ўздоўж магістральных вуліц. Перамен чакае і галоўная плошча горада — Славы. Што робіцца ў гэтым кірунку?***

— У адпаведнасці з рашэннямі Генеральнага плана горада гэтыя дамы плануецца зносіць, а зямельныя ўчасткі аддаваць пад шматпавярховую жылую забудову. Гаспадары гэтых дамоў атрымаюць магчымасць перасяліцца ў больш камфортнае гарадское жыллё. А што датычыцца плошчы Славы, то ўжо распрацавана праектная дакументацыя па яе абнаўленні. Не застаюцца без увагі падземныя пешаходныя пераходы і масты. Зараз вядзецца капрамонт падземнага пераходу на перакрыжаванні праспекта Міра і вуліцы Першамайскай. На праспекце Міра зроблены бягучы рамонт моста цераз раку Дзебру і працягваецца рамонт яшчэ аднаго — цераз Дубравенку. У распрацоўцы знаходзіцца праектна-каштарысная дакументацыя па капрамонце моста цераз Дубравенку па вуліцы Чалюскінцаў.

***— На стадыі зацвярджэння генплана Магілёва шмат спрэчак вялося вакол будучага гарадскога парку ў Падміколлі. Нарэшце кансэнсус быў знойдзены, і гэта месца сёння мяняецца на вачах.***

— Так, распрацавана праектная дакументацыя на аб'екты ўваходнай групы ў Падмікольскі парк. Ёй прадугледжваецца ўзвядзенне лесвіцы ад вуліцы К. Маркса, каскаднага вадаспада і фантана. Ужо вядуцца падрыхтоўчыя работы па ўладкаванні фантана і лесвічнага спуску з плошчы Арджанікідзе на вуліцу Вялікая Грамадзянская.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Вялікабрытанія гатова нанесці ракетны ўдар у адказ на магчымую кібератаку

Пра гэта заявіў міністр абароны краіны Майкл Фэлан падчас выступлення ў Каралеўскім інстытуце міжнародных адносін у Лондане.

Ён выступіў з папярэджаннем да хакераў, што нападзенне на дзяржаўныя ўстановы і інстытуты Вялікабрытаніі «можа прымусіць да адказу з любога асяроддзя: паветра, зямлі, мора і кіберпрасторы».

«У мінулую пятніцу мы сталі сведкамі чарговай кібератакі, на гэты раз накіраванай супраць інфармацыйных сістэм нашага парламента. Следства выявіла, што хакеры паспрабавалі ажыццявіць паслядоўную і рашучую атаку на ўсе ўліковыя запісы парламенцкіх карыстальнікаў, каб выявіць слабыя паролі для атрымання доступу да электроннай пошты», — адзначыў Фэлан, падкрэсліўшы пры гэтым, што ў Лондана «пакуль няма доказаў таго, хто менавіта стаяў за гэтай атакай».

### Апытанне: расіяне адчуваюць ваенную пагрозу з боку ЗША і Украіны

Большая частка грамадзян Расійскай Федэрацыі, якія лічаць рэальнай пагрозу ваеннага нападу на сваю краіну, бачаць патэнцыйным агрэсарам ЗША, каля трэці — Украіну, засведчыла апытанне, праведзенае Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі.

Пагрозу ваеннага нападу на Расію адчуваюць 38% грамадзян, 63% з іх асацыраваюць Злучаных Штатаў і 31% — Украіны. Таксама ў спіс патэнцыйных агрэсараў апытаныя ўключылі блок НАТА (7%), Кітай (5%), Вялікабрытанію, ІД (па 4%), Сірыю і Германію (па 3%).

Адзначым, што больш як палова рэспандэнтаў (53%) не разглядаюць магчымасць ваеннай пагрозы як рэальную.

Што датычыцца краін, ад якіх расіяне чакаюць падтрымкі ў выпадку вайны, сярод іх называлі Кітай (41%), Беларусь (25%), Казахстан (18%). На думку кожнага дзясятага (10%), шукаць дапамогі ў выпадку ваеннага нападу Расіі не было б у каго, — адзначана ў матэрыялах даследавання.

### Стывен Хокінг назваў тэрміны каланізацыі Месяца і Марса

Знакаміты брытанскі астрафізік Стывен Хокінг зноў заявіў, што чалавецтва павінна стварыць калоніі за межамі Зямлі, каб пазбегнуць выміраня з-за перанасялення, змяненняў клімату ці ў выніку падзення метэарыта, якое з'яўляецца толькі пытаннем часу, піша The Telegraph. З такой заявай вучоны выступіў на фестывалі навукі і мастацтваў Starmus, які праходзіць у нарвежскім Тронхейме.



Па словах Хокінга, перш неабходна заснаваць калоніі на Месяцы і Марсе, а таксама пабудаваць свайго роду «Ноеў каўчэг» з жывёламі, раслінамі, грыбамі і насякомымі, які дазволіць узнавіць зямную экасістэму ў іншых светах. Як адзначыў вучоны, калонія на Месяцы можа з'явіцца праз 30 гадоў, а на Марсе — праз 50 гадоў. Таксама Хокінг прапанаваў стварыць калонію за межамі Сонечнай сістэмы, на планеце Проксіма Цэнтаўра b, якая круціцца вакол найбліжэйшай да Сонца зоркі Проксіма Цэнтаўра.

«Я перакананы, што чалавецтва павінна пакінуць планету. Зямля стала занадта малой для нас, а яе рэсурсы практычна вычарпаны», — заявіў Хокінг.

Вучоны адзначыў, што за сваю гісторыю людзі ў пэўных рэгіёнах перажывалі падобныя крызісы, і звычайна яны пераадольваліся за кошт пашырэння межаў і стварэння калоній. Прыкладам таму служыць адкрыццё Амерыкі Калумбам у 1492 годзе. Аднак зараз шукаць новы свет можна толькі за межамі Зямлі.

■ Адукацыя+бізнес

# ПАСАДЗІЛІ НАСТАЎНІКАЎ... ЗА ПАРТУ

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і кампанія МТС маюць намер прадоўжыць сумесныя адукацыйныя праекты. Адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Вадзім БОГУШ і генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ.**

Упершыню падобнае пагадненне было падпісана год таму. І, як канстатуюць абодва бакі, гэты час прайшоў для ўсіх надзвычай плённа. Адзін з рэалізаваных сумесна праектаў — «Адказныя паводзіны настаўнікаў у сетках». Галоўная яго мэта — дапамагчы выкладчыкам карэктна і без рызыкі для сваёй рэпутацыі кантактаваць з вучнямі ў інтэрнэце. На жаль, але даволі часта складваюцца сітуацыі, калі паводзіны педагогаў у інтэрнэце адрозніваюцца ад іх паводзін у рэальным жыцці. Між іншым, ад гэтага залежаць і рэпутацыя настаўніка, і давер да яго з боку вучняў. Калі профіль педагога ў сацыяльнай сетцы адкрыты для ўсіх, а вучні знаходзяцца ў спісе яго сяброў, а не ў закрытай групе, калі адсутнічае кантроль за ўступленнем у закрытую групу — усё гэта сур'ёзныя фактары рызыкі. У віртуальнай рэальнасці мае вялікае значэнне, што, калі, каму і ў якой форме паведамляць, мае значэнне змест пастоў, якімі мы дзелімся, змест фотаздымкаў — уся гэта інфармацыя даступная староннім людзям нас ацэньваць і рабіць пра нас пэўныя высновы. Таму вельмі важна, каб не было дысанансу паміж настаўнікам на ўроку і настаўнікам у сацыяльных сетках. Каб выключыць падобныя сітуацыі, пры падтрымцы і ўдзеле МТС былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі і праведзены семінар для педагагічных работнікаў устаноў адукацыі сталіцы. У планах на наступны год — правесці падобныя навучальныя семінары і ва ўсіх абласных цэнтрах краіны.

Бадай што адзін з самых пазнавальных сумесных праектаў МТС і Міністэрства адукацыі — «Дзеці ў інтэрнэце». У гульнявой форме валанцёры расказваюць вучням малодшых класаў аб простых правілах, якія дазваляюць ім бяспечна карыстацца інтэрнэтам. Усяго за год да рэалізацыі ініцыятывы далучыліся больш як 400 валанцёраў па ўсёй Беларусі. Урокі па бяспечных паводзінах у сеціве прайшлі ў сталіцы, ва ўсіх абласных цэнтрах краіны і многіх раённых гарадах — Полацку, Наваполацку, Баранавічах, Пінску і іншых. Намаганнямі галоўнага настаўніка праекта Георгія Калдуна і добраахвотнікаў навучаны больш як 6500 дзяцей. У планах арганізатараў — працягнуць урокі для малодшых школьнікаў і распрацаваць праграму для вучняў сярэдняй школы.

Таксама ў рамках пагаднення ў дзесяці школах сталіцы быў рэалізаваны праект, дзякуючы якому настаўнікі могуць весці анлайн-журнал, вучні — карыстацца анлайн-дзённікам, а бацькі — з дапамогай смартфонаў і планшэтаў у рэжыме рэальнага часу назіраць за паспяховасцю дзяцей. «Інавацыйная школа» — гэта інтэрактыўная платформа, якой скарысталіся каля 8 тысяч бацькоў, 5,6 тысячы вучняў і 688 настаўнікаў у 230 класах.

У планах на найбліжэйшы год — арганізацыя IT-курсаў у аздараўленчых летніках. Мэта новага праекта — паказаць перспектыўнасць IT-сферы для дзяцей і разнастаіць іх адпачынак. Плануецца, што праект стартуе ўжо гэтым летам і IT-курсы будуць для дзяцей бясплатнымі.

— Сімвалічна, што заключэнне пагаднення адбылося ў дзень нараджэння кампаніі МТС, —падкрэслівае генеральны дырэктар кампаніі Уладзімір Карповіч. — Дзякуючы супрацоўніцтву з Міністэрствам адукацыі мы працягнем рэалізоўваць праекты, якія дапамогуць школьнікам, студэнтам і выкладчыкам больш пісьменна выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі ў сваім жыцці і ў навучальным працэсе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Стаўка рэфінансавання зніжаецца да 12%

**Стаўка рэфінансавання з 19 ліпеня зніжаецца з 13% да 12% гадавых. Аб гэтым паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. Стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў знізяцца з 15% да 14% гадавых.**

Гэтае рашэнне прынята па выніках праведзенага штоквартальнага пасяджэння праўлення Нацыянальнага банка па пытаннях ацэнкі і прагнозу тэндэнцый у эканоміцы, знешнім сектары і грашова-крэдытнай сферы з улікам замацавання станоўчых тэндэнцый у эканоміцы. Інфляцыя захоўваецца на нізкім узроўні. Паводле ацэнкі, сёлета ў чэрвені ў гадавым вымярэнні яна складзе каля 6,2%. Пры гэтым назіраецца аднастайнасць дынамікі інфляцыі па таварных групах, што сведчыць аб павышэнні ўстойлівасці яе запаволення. Гэта пацвярджае і дынаміка базавай інфляцыі, якая ў чэрвені ацэньваецца на ўзроўні каля 5,3% у гадавым выражэнні. Замацаванню гэтых тэндэнцый спрыяюць умераныя тэмпы росту грашовай прапановы, пазітыўныя змены ў збалансаванасці плацежнага балансу і ўстойлівасць валютнага рынку. Чыстая прапанова замежнай валюты, якая захоўваецца на ўнутраным валютным рынку, станоўча ўплывае на ўзровень золатавалютных рэзерваў і забяспечвае стабільнасць абменнага курсу беларускага рубля. На гэтым фоне працягваецца запаволенне інфляцыйных чаканняў, што спрыяльна адаб'ецца на інтэнсіўнасці росту цэн у наступныя месяцы.

Магчымасці далейшага зніжэння працэнтных ставак у эканоміцы будуць вызначацца ўстойлівасцю памяншэння інфляцыйных рызык. Стаўка рэфінансавання зніжаецца ў Беларусі ўжо у шосты раз з пачатку года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# Вірус «Petya» атакуе Беларусь

**Яшчэ не паспела сціхнуць гісторыя з вірусам WannaCry, які ў маі заблакаваў даныя ў сотнях камп'ютарных сістэм па ўсім свеце, як на гэтым тыдні па кіберпрасторы распаўсюдзіўся новы шкодны шыфравальшчык. Яго стваральнікі назвалі «Petya». Дзейнічае ён па такім жа прынцыпе, дасылаючы па электроннай пошце пад выглядам фінансавых справаздач, рэзюмэ ці простага архіва з дакументамі.**

На самай жа справе гэта праграма — файл мае расшырэнне EXE. Пасля яе запуску загрузіць аперацыйную сістэму ўжо не атрымаецца. На экране з'явіцца паведамленне, у якім зламыснікі выстаўляць рахунак за разблакіроўку вашы даных... Па звестках **начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Канстанціна ШАЛЬКЕВІЧА**, з заявамі ў міліцыю ўжо звярнуліся прадстаўнікі некалькіх буйных беларускіх кампаній.

— Вірус «Petya» з'яўляецца новым для ўсяго свету, — кажа **начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Вадзім УСЦІНОВІЧ.** — Некаторыя антывірусы ўжо навучыліся яго распазнаваць. Мы ж рэкамендуем пры з'яўленні на экране манітора паведамлення аб платнай дэшыфроўцы звяртацца ў міліцыю.

Засцерагчыся ад вымагальнікаў вельмі проста. Трэба выкарыстоўваць як мага больш складаныя паролі, бо вірус дзейнічае метадам падбору. Праграмнае забеспячэнне на камп'ютары мусіць быць ліцэнзійным, а антывірусную базу даных лепш абнавіць. І будзьце вельмі пільныя, атрымаўшы электроннае паведамленне з невядомага адраса. Гэтыя простыя захады дазволяць захаваць даныя без пагрозы шыфравання.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Госці

# СТАРАЯ СЛАВА НОВУЮ ВІТАЕ

**Тую ці іншую з'яву лепш за ўсё ацэньваць вачыма спецыялістаў. Асабліва калі яна ўнікальная, нават у сусветным маштабе. ААТ «Белгорхімпрам» па сваёй сутнасці — праектны інстытут, сем гадоў таму прыняў на сябе нязвыклую функцыю генеральнага падрадчыка, арганізатара будоўлі.**

Тут яшчэ важна — якой. За многія тысячы кіламетраў ад Мінска, у Туркменіі, не ўрад запланаваў распрацоўку радовішча калійных солей і ўзвядзенне абагачальнай фабрыкі. Тэндар выйгралі беларусы, абышоўшы туркаў, расіян і кітайцаў. Пад увагу быў прыняты вопыт пры праектаванні і ўзвядзенні руднікоў у Беларусі і Расіі.

У поспех далёкага і складанага праекта тады верылі няшмогія. Напачатку сапраўды ён «пайшоў» з неймавернымі цяжкасцямі. Спатрэбілася з нуля стварыць у гарачых Каракумах сваю вытворчую базу, «за свет» завозіць тэхніку і амаль два гады страціць на ўтаймаванне грунтовых і горных патокаў. Турбот хапала. Дапамагло тое, што інстытут — адзін з нямногіх у краіне, якія працуюць комплексна: ад правядзення навукова-даследчых работ, выканання геалагічных пошукаў да распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і праходжання экспертызы.

Выручыў і высокі прафесіяналізм, накоплены за папярэднія гады.

Праект ажыццяўляўся пад кантролем і пры падтрымцы ўрадаў і нават кіраўнікоў абедзвюх краін, што ў многім забяспечыла поспех. У сакавіку 2017 года падпісаны дакументы аб прыняцці важнага народнагаспадарчага аб'екта ў эксплуатацыю.

Значэнне здзейсненага беларусамі на берагах Амудар'і сапраўднага подзвігу яшчэ трэба будзе асэнсаваць. У ліку першых, хто зрабіў гэта, сталі выкладчыкі і спецыялісты горнага ўніверсітэта з Санкт-Пецярбурга, якія ў рамках тыднёвага знаходжання ў Беларусі перш-наперш прыйшлі ў «Белгорхімпрам».

Трэба было бачыць, з якім інтарэсам яны слухалі генеральнага дырэктара Вячаслава Коршуна, яго намеснікаў і прадстаўнікоў службаў, а потым задавалі сапраўды бясконцыя пытанні — пра «стрэсавыя» ўмовы працы, пра спецыфіку радовішча, вуглы залягання пароды, спосабы абагачэння руды — флатацыю... Для іх, як спецыялістаў, быў надзвычай цікавы Сярэднеазіяцкі каляносны басейн, які па ўмовах залягання прадукцыйных пластоў можна смела аднесці да найбольш складаных. Паняцця камерцыйнай тайны ў гэтай сяброўскай аўдыторыі не існавала, бакі бачылі адзін у адным калег і заўтрашніх партнёраў.

Потым адбылася — не, не проста экскурсія па падраздзяленнях інстытута, а больш шчыльнае знаёмства з магчымасцямі акцыянернага таварыства, вельмі прываблівымі. А таксама з людзьмі, надзвычай прафесійнымі і добразычлівымі. Кіраўнікі калектываў дамовіліся аб напрамках супрацоўніцтва, у першую чаргу ў галіне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў. І для «Белгорхімпрама», і для знакамітай расійскай ВНУ такая садружнасць, несумненна, будзе плённай.

Санкт-Пецярбургскі горны ўніверсітэт, заснаваны Кацярынай ІІ яшчэ ў 1773 годзе, стаў вядомым навуковым цэнтрам і слынной кузняй кадраў для самай складанай галіны эканомікі спачатку Расіі, потым Савецкага Саюза, цяпер СНД. Шмат іх, гэтых умелых і адданых справе спецыялістаў, працуе на салігорскім «Беларуськаліі», куды далей накіраваліся госці з берагоў Нявы.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ**

■ Фестывалі

# КЛІНЦЫ САБРАЛІ ПРЫМЕЖЖА

**Міжнародны фестываль «Славянскае адзінства—2017» 48-ы раз сабраў сяброў. Гэтым разам — у Клінцах Бранскай вобласці.**



Традыцыю пачынаць свята з набажэнства не парушылі і на гэты раз. Прадстаўнікі трох краін, а таксама Сербіі, прынялі ўдзел у Літургіі і асвячэнні купала і званоў кафедральнага Багаяўленскага сабора, які налета плануюць дабудаваць.

**Аляксандр БАГАМАЗ, губернатар Бранскай вобласці,** адзначыў, што фестываль «Славянскае адзінства» дагэтуль не страціў свайго значэння, а стаў больш прадстаўнічым:

— Самае галоўнае, ён надае новы імпульс супрацоўніцтву паміж нашымі краінамі ў імя вялікіх спраў нашых продкаў. А яны казалі: нельга забывацца, што пры аб'яднанні і малое расце, а пры разладзе і вялікае распадаецца.

Гэтую думку падхапіў **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА**, які пажадаў, каб агульныя вытокі славян нагадвалі пра неабходнасць жыць у згодзе:

— Вельмі важна, каб гэта гістарычнае сваяцтва захавалі нашы дзеці. Моладзь — наша надзея, апора, ад якой залежыць будучыня славянскай садружнасці і развіццё нашых дзяржаў.

«Даражэйшага і важнейшага за сяброўства ў свеце нічога няма. Толькі з ім можна пераадолець усе нягоды. Усім нам жадаю, каб Расія, Украіна, Беларусь былі моцнымі, незалежнымі і братэрскімі», — дадаў **украінскі паэт Анатоль МІРОНЕНКА.**

Больш як 50 актывістаў БРСМ Гомельскай вобласці прынялі ўдзел у міжнародным лагеры славянскай моладзі «Сяброўства-2017». Ён прайшоў на лясной паляне «Зацішынскі вадаспад» каля Клінцоў. У склад дэлегацыі ад Гомельшчыны ўвайшлі спартсмены, валанцёры, грамадскія актывісты, творчыя калектывы. **Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ Ігар ЗАВАЛЕЙ** кажа, што беларусаў прынялі на Браншчыне вельмі ветліва:

— Дэлегацыя Гомельшчыны была самай прадстаўнічай. Перамаглі мы ў футболе, дартсе, шматлікіх іншых спаборніцтвах, занялі другое месца па валейболе. Лідзіравалі ў шматлікіх творчых конкурсах. Былі вельмі карысныя стасункі моладзі прымежжа, завязаліся знаёмствы, кантакты.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Знаёмае месца

# ЗАПРАШАЕМ НА ВАЛЬС

## Танцпляцоўка для пенсіянераў «Сустрэча» адкрыецца восенню

Размова ідзе пра любімую пажылымі мінчанамі пляцоўку ў парку імя Чалюскінцаў. Рамонт пачаўся гэтым летам. У выніку будзе ўсталявана новая агароджа, тэнт (замест аварыйнага навеса), бетонную плітку заменяць на маналітнае цэментна-палімернае пакрыццё. З'явіцца новая каса з памяшканнем для часовага захоўвання асабістых рэчаў наведвальнікаў. Цалкам зменіцца ўнутранае аздабленне будынка танцавальнай пляцоўкі — падлогі, вокны, дзверы, інжынерныя сістэмы.

— Завяршыць работы па рэканструкцыі плануецца да кастрычніка, — паведаміў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Мінскзеленбуд» Ігар КУШНЯРЭВІЧ.**

Пакуль арганізавана альтэрнатыўная пляцоўка для танцаў — на перакрыжаванні Цнянскай і Цэнтральнай алей парку, плошчай каля 800 квадратных метраў. Адпачыць там пенсіянеры могуць у суботу і нядзелю з 16 да 19 гадзін.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# Па шляху Напалеона

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як заўважае **прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу БДУ, доктар гістарычных навук Андрэй ЛУКАШЭВІЧ**, найбольш перспектыўным для аднаўлення і ўключэння ў турыстычную справу мог бы стаць аб'ект у Верхнядзвінску, дзе пад значным слоем зямлі захаваліся рэшткі Дрысенскага ўмацаванага лагера, куды адступіла 1-я Заходняя армія і куды павінна была адысці 2-я армія. З гэтага, на цяперашні момант нічым не прыкметнага для турыстаў месца можна стварыць цудоўны турыстычны прадукт, не горшы за Лінію Сталіна. Прычым пра вайну 1812 года тут можна расказваць і гасцям з Прыбалтыкі, бо размяшчаецца гэты аб'ект недалёка ад мяжы.

**На Беларусі захаваліся мясціны, дзе спыняліся Аляксандр I і Напалеон I, дзе размяшчаліся іх галоўныя кватэры. Народная памяць захавала нават звесткі пра дрэвы, пад якімі адпачывалі ці пазіравалі імператары.**

Турыстычныя шляхі могуць пралягаць па мясцінах, дзе ўзводзіліся помнікі. Між іншым, пытанне аб ушанаванні падзей 1812 года ўзнімалася практычна з моманту заканчэння вайны. Так, яшчэ ў XIX стагоддзі ў межах агульнарасійскай праграмы падобныя аб'екты з'явіліся ў Клясціцах і Полацку.



Таксама помнікі ставіліся і да стагоддзя вайны — у тыя часы на Беларусі іх з'явілася сем, пяць — захаваліся да нашых дзён.

У савецкі час стаўленне да помнікаў, узведзеных у папярэднюю эпоху, было супярэчлівым, на жаль, многія манументы разбурылі. Трэба сказаць, што пасля абвяшчэння незалежнасці ў Беларусі сталі аднаўляцца і ўзнікаць новыя збудаванні, звязаныя з вайной 1812 года. Сярод адноўленых — абеліск на Брылеўскім полі, капліца ў Паддубе, манумент у Полацку і памятны знак у Студзёнцы. З'явіліся і новыя кропкі — на Брылеўскім полі за французскія грошы, а ў Студзёнцы за швейцарскія былі пастаўлены помнікі воінам Вялікай Арміі.

Таксама турыстычныя маршруты могуць пралягаць па мясцінах, дзе знайшлі спачын воіны. Так, на сёння захаваліся помнікі і культавыя збудаванні на месцах пахаванняў генералаў і старшых афіцэраў — удзельнікаў вайны 1812 года. На нашай тэрыторыі загінулі дзясяткі тысяч воінаў расійскай і напалеонаўскай армій. На жаль, большасць пахаванняў, якія ўзніклі адразу пасля баёў, не былі ўлічанымі, і паступова пра іх забыліся. Толькі планавыя археалагічныя раскопкі ў мясцінах найважнейшых баёў дазваляюць знаходзіць брацкія магілы і перазахоўваць астанкі воінаў.

## Ці быць беларускаму помніку?

Што дзіўна, усе помнікі, якія сёння стаяць на нашай зямлі, — не важна, пастаўлены яны ў царскую эпоху, савецкую ці пазней, — распавядаюць пра чужую гісторыю. У Беларусі няма ніводнага помніка суайчыннікам, якія загінулі ў 1812 годзе.

Так, у той вайне беларусы змагаліся на розных баках. Дзясяткі тысяч беларускіх сялян былі рэкрутаваны ў армію Расійскай імперыі, тысячы папоўнілі войска Вялікага Княства Літоўскага. Прадстаўнікі шляхецкіх і магнацкіх родаў падтрымалі Напалеона. Крывапралітныя баі, у якіх ваяры з абодвух бакоў паказвалі цуды мужнасці і гераізму, працягваліся з чэрвеня па снежань 1812-га. І на тэрыторыі Беларусі палягло нямала яе сыноў. Акрамя таго, землі, дзе ішла вайна, былі спустошаны, мірным жыхарам даводзілася карміць паўмільённую французскую і двухсоттысячную расійскую армію. Пры адступленні часта выкарыстоўвалася тактыка «выпаленай зямлі», што асуджала мясцовае насельніцтва на голад.

І хіба не ўражвае той факт, што на Беларусі, якой гэта вайна не прынесла нічога, акрамя страт, захавалася столькі помнікаў? Чаму б гэта не выкарыстоўваць пры стварэнні экскурсій, не падганяць пад сучасны кантэкст? У такіх мясцінах госці могуць не толькі паглыбляцца ў гісторыю, але і бачыць, як важна шанаваць памяць і цаніць мір. І, на думку Андрэя Лукашэвіча, у нашай краіне варта было б паставіць помнік усім беларусам, што загінулі ў той вайне, незалежна ад таго, на чыім баку яны змагаліся.

Ужо не першы год вядзецца гаворка аб стварэнні ваенна-гістарычнага музея-запаведніка на Бярэзіне. Найперш трэба распрацаваць комплексную праграму, якая датычыцца гэтага аб'екта, правесці сур'ёзную навуковую работу. Для прыкладу, даследаванні, звязаныя з Барадзінскім полем, распачаліся з 1839 года і працягваюцца па сёння. Важна захаваць і месцы баёў, бо калі тэрыторыя не мае статусу ахоўнай зоны, яна знішчаецца, шкоду наносяць і так званыя чорныя капальнікі.

А як не выкарыстаць у турызме «імператарскую тэму»? На Беларусі захаваліся мясціны, дзе спыняліся Аляксандр I і Напалеон I, дзе размяшчаліся іх галоўныя кватэры. Народная памяць захавала нават звесткі пра дрэвы, пад якімі адпачывалі ці пазіравалі імператары. Прычым, для таго каб захаваць такія аб'екты і зрабіць прыкметнымі ў турыстычнай галіне, трэба не так многа. Устаноўка памятных дошак з барэльефамі дазволіць завабіць турыстаў у невялікія гарады і вёскі, якія могуць расказаць пра імператарскія мясціны.

Сёння існуюць маршруты па месцах баёў 1812 года ў Віцебскай, Брэсцкай і Мінскай абласцях, але часта стваральнікі падаюць іх на аматарскім узроўні, некаторыя цікавыя аб'екты яны не выкарыстоўваюць, а бывае, наогул, выдаюць скажоную інфармацыю. І гэта ў той час, калі навукоўцамі створаны дапаможнікі, якія могуць быць выкарыстаны ў турыстычнай галіне. Сярод іх — зборнік «Беларусь і вайна 1812 года. Дакументы», які быў падрыхтаваны супрацоўнікамі Нацыянальнага гістарычнага архіва, і кніга «Помнікі і памятныя мясціны 1812 года ў Беларусі». Распрацавана нават карта, на якой паказаны не толькі мясціны баёў, шляхі, па якіх ішлі імператары, але і помнікі і музеі, у якіх размешчаны пастаянныя экспазіцыі, звязаныя з вайной 1812 года.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

# ЯК УПРЫГОЖЫЦЬ І АБАРАНІЦЬ ДВАРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Комплекс гэтых работ падзяляецца на катэгорыі «вулічна-дарожная сетка», «асвятленне» і «іншае добраўпарадкаванне за выключэннем». Да апошняга «выключэння» і адносяцца работы па ўтрыманні прыдамавых тэрыторый. Летась Указам Прэзідэнта №535 «Аб прадастаўленні жыллёва-камунальных паслуг» работы па ўтрыманні прыдамавых тэрыторый былі выключаны з пераліку работ па тэхабслугоўванні жылога дома. Цяпер яны павінны рэалізоўвацца за кошт бюджэту. Таму міністэрства фінансаў дадаткова выдзеліла на гэта пэўную суму. Аднак гэтыя грошы «растварыліся» ў агульным добраўладкаванні.

## Дадатковыя паслугі і недахоп зямлі

Указам №535 прадугледжана таксама, што падтрыманне і аднаўленне санітарнага і тэхнічнага стану прыдамавых тэрыторый шматкватэрных жылых дамоў здзяйсняецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. Прыдамавыя тэрыторыі, якія былі перададзены ў арэнду або для абслугоўвання таварыствам уласнікаў ці арганізацыям-забудоўшчыкам, абслугоўваюцца за кошт уласных сродкаў гэтых суб'ектаў.

— Разам з тым грамадзяне па ўласным жаданні і дамоўленасці з ЖКГ могуць абсталяваць за свае сродкі ў двары, напрыклад, дзіцячую пляцоўку. Існуе таксама дадатковая жыллёва-камунальная паслуга — стварэнне элементаў добраўпарадкавання на тэрыторыі і іх далейшае ўтрыманне, што робіцца са згоды ўсіх жыхароў, — абазначыла прадстаўніца Мінжылкамгаса.

Гаворачы пра добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, трэба звярнуць увагу на планаванне гэтай тэрыторыі згодна з ТКП «Горадабудаўніцтва ў населеных пунктах. Нормы планіроўкі і забудовы».



— Згодна з нарматывамі па фарміраванні дваровай прасторы, на выдзеленым участку зямлі павінны размяшчацца не толькі дом, а і паркоўка са стаянкай, дзіцячая пляцоўка, месца для выгулу сабак, кантэйнераў са смеццем і іншае, — заўважыла **Таццяна ГАЎРЫЛЕНКА, начальнік аддзела горадабудаўніцтва галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі.** — А як я на невялічкім пятачку змяшчу дом у 20 паверхаў і ўсё, што трэба да яго? У мяне зямельны ўчастак скончыўся ўжо на паркоўках са стаянкамі. Мы неаднойчы пісалі лісты ў Мінгарвыканкам, каб спецыялісты, выдзяляючы ўчастак пад адміністрацыйныя і офісныя будынкі, звярталі ўвагу, што стаянкі павінны змяшчацца на той зямлі, якая вылучана пад будаўніцтва, а не дзесьці, дзе ёсць месца.

## Паркавачны эксперымент

Праблема ўстаноўкі шлагбаўмаў вельмі хвалюе грамадзян і мясцовыя органы. Больш за ўсё зваротаў па гэтым пытанні паступае ад мінчан, нягледзячы на існуючае рашэнне Мінгарвыканкама ад 22 верасня 2016 г. №2786 «Аб некаторых пытаннях устаноўкі прылад, якія абмяжоўваюць рух транспартных сродкаў (шлагбаумаў) на прыдамавых і ўнутрыдваровых тэрыторыях у г. Мінску». З іншых рэгіёнаў краіны такіх зваротаў значна менш — па два-тры з вобласці.

— Каб зняць напружанасць па гэтым пытанні, Мінбудархітэктура падрыхтавала праект рэкамендацыйнага пісьма аб усталяванні шлагбаумаў, якое мы хочам зрабіць сумесна з Мінжылкамгасам. На мінулым тыдні мы накіравалі ім гэты праект і спадзяёмся, што на працягу месяца ён будзе падпісаны, — падзялілася Таццяна Гаўрыленка. — Існуючай нарматыўнай базы па ўстаноўцы шлагбаума дастаткова, аднак мясцовым органам неабходна кіраўніцтва да дзеяння. У пісьме па пунктах распісана, як, чаму і навошта, куды звяртацца заяўнікі і што рабіць.

Тым часам на сайце Мінбудархітэктуры пачынае працаваць раздзел «горадабудаўніцтва», дзе змяшчаецца ўся інфармацыя па пытаннях, нават лісты і рэкамендацыі, якія накіроўваюцца таксама ў прававую базу «Кансультант».

Праўда, застаецца нявырашаным шэраг пытанняў адносна кошту ўстаноўкі такой прылады для жыхароў і чыста тэхнічныя моманты. Як будзе налічвацца электраэнергія за работу шлагбаума? У каго будзе чып ад яго? Як будзе арганізаваны пад'езд хуткай дапамогі і іншае. Па самых сціплых прыкідках устаноўка абыдзецца прыкладна ў 3000 рублёў.

Найбольш зацікаўлены ў тым, каб закрыць двор «на шлагбаум», жыхары цэнтра сталіцы.

— У людзей узнікае жаданне абараніць перш за ўсё нават не двор, а сваю сям'ю. Наўрад ці камусьці спадабаецца, каб на месцы аўто чалавека, які з'ехаў на працу, увесь дзень стаяла машына «чужака», які прыехаў на працу ў офіс, што непадалёк. Ён не жыве ў доме, каля якога паставіў машыну, і стаўленне ў яго да гэтага двара адпаведнае. Сама бачыла, як у адным з двароў машына стаяла ў дзіцячай пясочніцы, — адзначыла прадстаўніца Мінбудархітэктуры.

Галіна Гілевіч расказала пра незвычайны эксперымент, які датычыцца адной платнай паркоўкі, распачаты ў сталіцы:

— У адным з двароў у раёне чыгуначнага вакзала мы ўсталявалі відэакамеры, што будуць фіксаваць нумары ўсіх машын, якія ўязджаюць на тэрыторыю, і заносіць іх у базу. З тых, хто не жыве ў дамах і не арандуе там памяшканне, будуць браць плату за паркоўку. Папераджальныя знакі пра гэта там таксама змешчаны.

Пры гэтым сума за паркоўку будзе ў разы большай, чым на звычайных платных паркоўках, а з тых, хто адмовіцца плаціць, грошы будуць спаганяць праз суд.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

## Будзь у курсе!

# Тэлефон для тваёй дапамогі «Анёлу»

**МТС адкрыў USSD-нумар для дабрачыннай дапамогі пошукава-выратавальнаму атраду «Анёл». Цяпер, каб пералічыць грошы на карысць арганізацыі, дастаткова даслаць USSD-запыт на кароткі нумар *222*13#. Такім чынам на рахунак пошукава-выратавальнага атрада паступіць два рублі. Калі вы хочаце ахвяраваць больш буйную суму, адпраўце некалькі запытаў.**

Зрабіць ахвяраванне могуць абаненты ўсіх тарыфных планаў МТС для фізічных асоб. Пра тое, што грошы паспяхова пералічаны, стане вядома праз sms-паведамленне. Кошт кожнага такога пацвярджэння — 0,04 руб.

— Мы ўпэўненыя, што кожнаму па сілах хоць бы трохі змяніць свет да лепшага, і мы таксама імкнёмся да гэтага. Кампанія МТС займае актыўную сацыяльную пазіцыю і садзейнічае дабрачынным арганізацыям. Нашы ініцыятывы падтрымліваюць і нашы абаненты, — сказаў кіраўнік камерцыйнага дэпартамента кампаніі МТС Яўген Бранцаў.

Каб адправіць дабрачынны перавод, рэшта на асабовым рахунку пасля здзяйснення аперацыі павінна складаць не менш як 0,3 рубля для абанентаў з авансавым метадам аплаты паслуг і 0,00 рубля для кліентаў з крэдытным метадам.

Пошукава-выратавальны атрад «Анёл» — першы ў Беларусі дабрачынны рух па аказанні дапамогі ў пошуку без вестак зніклых людзей. Атрад створаны ў чэрвені 2012 года групай валанцёраў, сёння колькасць добраахвотнікаў дасягае больш чым 100 000 чалавек. «Анёл» дапамагае бязвыплатна. За 2016 год у арганізацыю па дапамогу звярнуліся каля 550 разоў. У выніку працы атрада толькі за мінулы год былі знойдзены 127 чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



## ДЗВЕ ЦУКЕРКІ

У Рымачкі дзень нараджэння. Ёй — 31. Дзяўчына падводзіць вынікі: «Чалавекам года стаў мой муж. Яго падтрымку я адчуваю кожны дзень. І мой сын, бо ніхто, акрамя яго, не прымусіць мяне ўзяцца за ўласнае выхаванне».

Днямі атрымала паведамленне ад калегі: «Ну, як табе сямейнае жыццё? Можа, я старамодны, але па мне, сям'я — гэта самае лепшае месца на зямлі». — «Пагаджуся, — адказваю. — Галоўнае сустрэць свайго чалавека!» — «Вось і я пра тое. Пастаянна паўтараю сваёй дачцэ, што ні ў якім разе нельга спяшацца! Закахалася яна па вушы. А мы цвяроза бачым, што ён тыповы альфонс і эгаіст. Збоку вельмі добра відаць. Дзяўчаты гэта разумеюць, але часам вельмі позна. Часта — пасля нараджэння дзіцяці, якое становіцца галоўным пацярпелым. Але нам, можна сказаць, пашанцавала: бойфрэнд дачкі сам падставіўся вельмі крута. На словах «кахаю цябебольшзажыццёжыцьбезцябенемагу», а як яна трапіла ў аварыю (разбіла сваю машыну, чужую, дзякуй богу, сама цэлая засталася), ён быў занадта заняты, каб прыехаць. Вядома, слёз было нямала. Дачка чакала, што мы прыедзем дадому, а ён каля пад'езда стаіць».

У цяжкія моманты ўсім патрэбная падтрымка. Але, на жаль, не ўсе гатовыя раздзяліць боль блізкіх.

Святлана Іванаўна з мужам пражыла больш як 20 гадоў. Многія ёй зайздросцілі, бо яе Саша не курыць, не п'е, няблага зарабляе. Але здарылася няшчасце, жанчына захварэла. Перажыла некалькі аперацый, ёй выдалілі грудзі. А бяда, як часта здараецца, адна не ходзіць. Дачка нарадзіла дзіця раней за тэрмін. Унучка з'явілася на свет слабенькай, у яе былі праблемы з ручкай — пальчыкі былі зросшыя. Дзед, як убачыў малечу, адразу выпаліў: «Трэба ад яе адмовіцца!» Дачка ў слёзы. А я яму: «Здурнеў, ці як? Што ты такое кажаш?» Муж на мяне накінуўся: «Маўчы, недарэзаная. Скажы дзякуй, што яшчэ жыву з табой». Месяц мы не размаўлялі, а потым ён сабраў рэчы і з'ехаў да іншай жанчыны. Вось так і адбіўся мужык ад дома, не вытрымаў нашых хвароб».

Нядаўна знаёмая ў сваім блогу падзялілася кранальным дзённікавым запісам невядомага мужчыны. «Ехаў я ў маршрутцы. На сядзенні побач дзіця, гадоў шасці, тузала маці за руку. Жанчына ж глядзела ў акно і не рэагавала. І тут раптам яна як развернецца і як прашыпіць: «Што ты ад мяне хочаш?! Ды ты наогул ведаеш, хто ты такі?! Ты ніхто! Зразумеў? Бачыць цябе не магу!» Хлопчык прыціх. Жанчына ж адкінула яго руку і зноў развярнулася да акна. А ў мяне было жаданне ўстаць і пры ўсіх разарваць яе на часткі. Сказаць ёй: «Гэта ты ніхто! Ты ж забіла яго!» Але мае думкі перапыніла цукерка... Дакладней, дзве. Юнак, такі светлы, курчавы, працягнуў іх хлопчыку. Той узяў, але есці не стаў. Ён дакрануўся да мамінай рукі. Жанчына павярнулася і, відаць, хацела «дабіць» дзіця. Але хлопчык паклаў ёй цукерку ў далонь. Ніколі не забудуся гэтую паўзу. І гэту даросласць. Перада мной за некалькі хвілін хлопчык стаў мужчынам, а яго маці са злой і раздражнёнай — прыгожай маладой жанчынай. Яна доўга маўчала. Потым абняла сына. І ён яе абняў. Затым хлопчык разгарнуў цукерку і даў маці. І пакуль яна не паклала яе ў рот, не еў сам. Я тады падумаў пра сябе: «Вось ты, такі праведнік, хацеў устаць, абвінаваціць, «разарваць» яе. І нічога не дабіўся б, акрамя скандалу. А гэты хлопчык, наколькі ж ён мудры, узяў іншым. ...А яшчэ гэты юнак з цукеркамі, ён жа не проста так даў дзве.

Я назаўсёды запомніў той урок. Але толькі праз гады зразумеў, што гэта і ёсць сапраўднае выхаванне. Пра якое не ўсе дарослыя ведаюць. Што толькі прыкладам і выхоўваюць. Не крыкам, не абвінавачваннямі, не біццём, не. Толькі прыклад працуе, больш нічога. І хлопчык гэты паказаў прыклад. І ёй, і мне. Дзе ён, гэты хлопчык? Дзе ты, хлопчык?! Як ты нам патрэбны ўсім, а?! Мы без цябе прападзём».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


# Сямейная газета

**Выпуск № 12 (79)**


■ Гэта па-нашаму!

# ТОЛЬКІ ПРОСТЫЯ СЛОВЫ ДЫ ПРОСТЫЯ РЭЧЫ




Фота Сяргея ПІЛІПОВІЧА.

**Праграміст Павел і піяр-менеджар Адарка зусім нядаўна сыгралі незвычайнае вяселле. Мала таго, што яны самі былі ў стылізаваных беларускіх строях, дык яшчэ і заахвоцілі падтрымаць канцэпцыю свята сваіх сваякоў і сяброў. Госці ўвесь дзень стараліся размаўляць на роднай мове, развучвалі народныя танцы, а замест купленых сокаў пілі бацькоўскі бярозавік. Нядаўна сям'я Шутоў вярнулася з «мядовага месяца» (правялі яго ў Непале, у горным паходзе). Яны расказалі сваю неверагодную гісторыю знаёмства, а таксама пра тое, як падчас падрыхтоўкі да вяселля «давялі» бабулю да слёз.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Тыя, хто побач

Шматдзетная балерына — пра дзяцей, анёла-ахоўніка і свабоду выбару сваёй будучыні

**Ірына ЯРОМКІНА:**

# «Я ЗАЎСЁДЫ МАРЫЛА БЫЦЬ МАМАЙ»



Дзеці з Ірынай побач нават у тэатры: на рэпетыцыях і ў грымёрцы.

**Балерына — шматдзетная мама — выпадак, напэўна, унікальны. Асабліва для беларускага балета. Сёння Ірына ЯРОМКІНА — заслужаная артыстка Беларусі, выканаўца галоўных партый у сусветна вядомых спектаклях, сярод якіх «Спартак», «Спячая прыгажуня», «Лебядзінае возера», клапатлівая маці Максіма, Ксюшы і Каці і ўважлівая дачка. Глядзіш на яе — і не разумееш: як такая вытанчаная (але пры гэтым моцная) жанчына ўсё паспявае: сумяшчаць жыццё на сцэне і ў сям'і? А яна потым прызнаецца ў размове, што ніколі не марыла пра славу і заўсёды ведала: «Калі Бог даў дзіця, значыць, так трэба...»**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Размовы пра важнае

# НЕЗВЫЧАЙНАЯ ДАБРАЧЫННАСЦЬ,

## або Як папіць кавы з сэнсам

**Папіць кавы з Аляксандрам Саладухам, палятаць на верталёце з вядомым айці-бізнесменам, трапіць на трэніроўку да чэмпіёнкі свету па мадэльным фітнесе. І пры гэтым паўдзельнічаць у дабрачыннасці. Шэсць гадоў таму беларускія студэнты-праграмісты запусцілі праект, дзе аўкцыёны сустрэч дапамагаюць збіраць грошы на добрыя справы. За час існавання «МаеСэнс» было праведзена 66 тысяч такіх аўкцыёнаў і сабрана амаль 900 тысяч рублёў. Пра папулярныя сустрэчы, самыя дарагія лоты, культуру дабрачыннасці і шчодрасць мы пагаварылі з адным з заснавальнікаў праекта Дзянісам КАНДРАТОВІЧАМ.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Чаму вырашылі запусціць праект, звязаны з дабрачыннасцю?***

— Ідэю не мы прыдумалі. Некалі аўкцыён сустрэч правялі ва Украіне. Гэта была аднаразовая акцыя. Яе ўбачылі беларусы і вырашылі таксама зрабіць, стварылі суполку ва УКантакце. Мы з сябрам далучыліся да гэтай суполкі і прыдумалі праводзіць аўкцыёны пастаянна, кожны месяц.

Калі вучыліся ва ўніверсітэце, займаліся гэтым як хобі. Пасля працавалі з партнёрам на асноўных работах, але праект з сустрэчамі патрабаваў шмат часу. Мы вырашылі аблегчыць справу, аўтаматызаваць яе і запусціць сайт. Але ў выніку гэта стала займаць яшчэ больш часу. Паступова мы пайшлі на палову працоўнага дня, а праз паўгода цалкам пераключыліся на праект.

**«Хтосьці хоча адчуць сябе важным, хтосьці выкупіць сваю віну. Гэта абсалютна нармальна. Горш было б, каб не было ніякага матыву дапамагаць».**

Насамрэч апошнім часам нельга сказаць, што сайт на піку актыўнасці. Літаральна пару месяцаў таму статыстыка наведвання была крытычна нізкай, і мы вырашылі ўзяцца за прасоўванне зноў. Цяпер набіраем новую каманду, хочам крыху трансфармаваць праект. Плануем прыцягнуць туды дадатковае фінансаванне, зрабіць нарэшце мабільную праграму.

***— Каго запросіце ў каманду: вопытнага спецыяліста ці добрага чалавека?***

— Спецыяліста. Бо дагэтуль набіралі добрых людзей, у якіх «гараць» вочы, і не заўсёды атрымлівалі чаканыя вынікі. Шукаем прафесіяналаў у галіне анлайн-прасоўвання, хочам зменшыць афлайн-актыўнасць. 15 гутарак правялі, перш чым узялі чалавека на пасаду анлайн-маркетолага. Праект цяпер не на той стадыі, каб на ім практыкаваліся. А добрыя людзі могуць паўдзельнічаць інакш: выставіць сустрэчу на аўкцыён, ахвяраваць грошы нейкай ініцыятыве.

***— Чытала, што версіі «МаеСэнс» запускаліся ў іншых краінах.***

— Так. Мы збіліся з ліку: у Расіі штук 20 запускалася і закрывалася. Праблема ў чым? Звычайна сайт запускаюць айцішнікі, якія бачаць, што тэхналагічны складнік праекта вельмі просты. Але там шмат бізнес-працэсаў, зусім не звязаных з IT-галіной. Пераводы, дагаворы... Вялікая папяровая цяганіна. Самая складаная работа — па праверцы дакументаў. У «МаеСэнс» за столькі гадоў ні разу не было пераводу нядобрасумленным дабрачынцам.

***— Якія сустрэчы часцей прапануюць?***

— Я вылучыў бы некалькі тыпаў. Часта сустрэчу з сабой выстаўляюць прафесіяналы ў пэўнай галіне ці славутыя персоны. Яны расказваюць пра сваю дзейнасць, даюць майстар-клас. Летам прапануецца шмат прагулак на веласіпедах, зімой — на каньках. Самая папулярная сустрэча — проста папіць кавы, пазнаёміцца. Для людзей часта гэта праблема: што цікавага прапанаваць? Яны недаацэньваюць сябе. Мы ж лічым, што кожны ў нечым эксперт.

***— Якія лоты станавіліся самымі дарагімі?***

— Калі крутыя эксперты выстаўлялі з сабой сустрэчы. Я памятаю, за адну з такіх, з айцішнікамі, сума даходзіла да чатырох тысяч долараў.

***— А што незвычайнага прапаноўвалі?***

— Вельмі шмат чаго. Пакатацца на самалёце, на паветраным шары... Нядаўна хлопец прапаноўваў паездку на два тыдні на Балі.

***— А вы самі лоты выстаўлялі?***

— Так, апошні літаральна на мінулым тыдні. У нас на сайце можна папрасіць выставіць сустрэчу. Нехта заходзіць, націскае кнопку, і табе прыходзіць паведамленне. Я адразу адгукнуўся — было б непрыгожа адмовіцца. Прапаноўваў розныя лоты. Вельмі люблю хадзіць у кіно. Таксама пікнікі праводзілі, масавыя велакатанні, гулялі ў настольныя гульні.

**«Для людзей часта гэта праблема: што цікавага прапанаваць? Яны недаацэньваюць сябе. Мы ж лічым, што кожны ў нечым эксперт».**

***— Якую сустрэчу самі купілі б?***

— Я люблю пэўныя віды спорту. Напрыклад, машынай кіраваць. Зусім нядаўна якраз выйграў лот — пакатацца на аўто, якія ўдзельнічаюць у ралі. Думаю, будзе вельмі цікава.

***— Хто асноўныя карыстальнікі праекта?***

— Моладзь ад 18 да 30 гадоў. Сустрэчы часцей прапануюць дзяўчаты. Ім цікава, колькі за сустрэчу заплацяць, — такое спаборніцтва. Цікава пазнаёміцца з хлопцамі, які вылучыць яе з усіх. Хлопцы выстаўляюць лоты радзей. Напэўна, гэта з менталітэтам звязана: у нас не прынята, каб дзяўчаты плацілі за сустрэчу, першыя аказвалі знакі ўвагі.

***— Пары складваліся?***

— Так. Было некалькі вяселляў. Спачатку мы нават за гэтым сачылі.

***— Не крыўдзіцеся, калі «МаеСэнс» параўноўваюць з сайтам знаёмстваў?***

— Не. Для людзей гэта адна з асноўных патрэб у жыцці — заводзіць новыя знаёмствы. І калі мы, прыўносячы ў свет дабро, дапамагаем людзям добра правесці час, вельмі рады гэтаму. Але ўхіл нашага рэсурсу — дабрачыннасць.

***— Наколькі праект па дабрачыннасці можа быць самаакупным?***

— У нас наступная бізнес-мадэль: бярэцца працэнт ад абароту. За кошт камісіі ад пералічэнняў мы і жывём. Адзіны спосаб для сацыяльнага праекта быць стабільным — гэта зарабляць. Для мяне заўсёды важны былі метрыкі, маркетынг.

Вельмі шмат сумных гісторый, і хочацца дапамагчы ўсім. Бывае імкненне — накіраваць максімум заробленых грошай непасрэдна на дабрачыннасць. Але ў доўгатэрміновай перспектыве гэта прывядзе да таго, што праект закрыецца. Мы хочам зрабіць сайт прыбытковым, каб не толькі сёння мець магчымасць дапамагчы.

***— Ці лёгка сёння сацыяльнаму прадпрымальніку знайсці інвестара?***

— Складана, лічу. Бо, як правіла, сацыяльным прадпрымальніцтвам у нас займаюцца людзі, якія выйшлі з дабрачыннасці. У іх няма бізнес-жылкі, яны рэдка могуць растлумачыць інвестару, як іх праект будзе развівацца. Само паняцце «інвестар» мае на ўвазе, што ў будучыні чалавек атрымае нейкі зварот з укладзеных сродкаў.

Сацыяльная дзейнасць не прасцейшая за бізнес. Лёгка атрымаць лайкі ў сацсетках, а вось рэальнае фінансаванне...

***— Што адбываецца з культурай дабрачыннасці ў краіне?***

— Вядома, развіццё ёсць. Але цяпер крызіс і адчуваецца, што і кампаніі, і асобныя багатыя персоны менш хочуць падтрымліваць сацыяльныя праекты. Мне здаецца, беларусы — вельмі добрыя людзі. Проста тыя, хто збірае грошы на дабрачыннасць, не заўсёды могуць сваю ідэю правільна сфармуляваць і данесці.

***— Ёсць назіранне, што людзі ахвотней ахвяруюць грошы, калі атрымліваюць нешта ўзамен — сувенір, напрыклад...***

— Чалавек заўсёды хоча нешта атрымаць. Нават калі просіць нічога не дарыць яму. Усё, што чалавек робіць, — робіць для сябе. Такая прырода: хтосьці хоча адчуць сябе важным, хтосьці выкупіць сваю віну. Гэта абсалютна нармальна. Горш было б, каб не было ніякага матыву дапамагаць.

***— На вашу думку, шчодрасць — гэта што?***

— Уменне дзяліцца. Эмоцыямі, грашыма. Калі ўмееш дзяліцца — то шчодры.

***— Як праект паўплываў на вас?***

— Я завёў шмат цікавых знаёмстваў. Для мяне гэта быў важны матыў, каб займацца праектам.

***— Што для вас мае сэнс?***

— Пастаяннае развіццё. Як той казаў, у сучасным свеце, каб стаяць на месцы — трэба бегчы, каб рухацца наперад — трэба бегчы вельмі хутка. Без развіцця нецікава жыць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Бабуля, пачытай!

# ФІКУС



Ніначка вярталася са школы. Задаволеная і радасная. Ляцела дадому як на крылах. Хацела пахваліцца матулі, як прайшлі заняткі. Сёння ж яна атрымала добрыя адзнакі па беларускай мове і літаратуры. Была задаволеная яшчэ і тым, што строгая настаўніца, Лідзія Маркаўна, пахвеліла яе перад усім класам. Сардэчнае слоўка, вядома ж, не толькі ўздымае настрой. А заўсёды дапамагае ў жыцці і вучобе.

Азіралася навокал вучаніца шостага класа, ды толькі дзівілася сама сабе. Вось і зімка ўжо завітала. Халодная, калючая. Учора было яшчэ цёпла. І сонейка вандравала ў сініх нябёсах. А сёння ўжо мяцеліца шалёна скача па вуліцы. Старанна замятае ўсе сцяжынкі. І нават шырокі шлях не пазнаць! Адразу стаў пухнатым, сівым, бы той дзед стары. Дрэвы і кусты таксама накінулі на сябе бялюткі вэлюм. Зрабіліся чужымі, незнаёмымі.

Падняўшы вышэй каўнерык і нацягнуўшы на вушы мяккую шапачку, падбегам накіравалася на сваю вуліцу. Каля крамы, здзіўленая, на хвілінку прыпынілася. І літаральна застыла. На ганку ўбачыла невялічкі фікус. Сняжынкі амаль заляпілі ўсе яго ныя зялёныя лісцікі. Зблеклая кветка выглядала сіратлівай і самотнай. Ніначка крыху жахнулася. Нават сэрца забілася шпарчэй у грудзях.

Падышла бліжэй, пільна прыглядзелася. На ўваходных дзвярах заўважыла вялізны замок. Зразумела, што гаспадары камерцыйнай крамы вырашылі пазбавіцца ад фікуса. Пэўна, гэта былі абыякавыя, эгаістычныя людзі. І не пашкадавалі, а раўнадушна выкінулі прыгожую кветку на вуліцу. І не падумалі пра тое, што зіма ўжо пануе ў прыродзе. Дый мароз на парозе стаіць. Цярпліва чакае, пакуль мяцеліца ўволю нагуляецца.

Раптам школьніца пачула:

— Дзяўчынка, прашу, забяры мяне адсюль. Да сябе ў цёплую кватэру. Інакш — загіну! Мароз мяне ўначы ўмомант знішчыць. Шмат месца на падаконніку не займу. І пастараюся стаць табе патрэбным, нават карысным.

Ніначка, здзіўленая, нахілілася ніжэй.

— А чаму ты тут апынуўся, — пацікавілася яна. — Няўжо месца не хапіла ў гэтай краме? Ці не хацелі даглядаць, паліваць?

— Мабыць, не жадалі даглядаць мяне, — самотна адказаў фікус. — А я так стараўся ўсім прадавачкам спадабацца, дагадзіць... Але ж, як бачыш, нічога добрага з гэтага не атрымалася. Мяне чамусьці выкінулі на ганак, як непатрэбную рэч!

— Толькі не сумуй. Так і быць! Забяру цябе да сябе ў цёплую кватэру, — супакоіла Ніначка. — Скажу пад сакрэтам: даўно марыла займець такую прыгожую кветачку.

Дзяўчынка шчаслівая ўсміхнулася. Пяшчотна пачысціла рукавічкай кожны лісцік ад сняжынак. І, задаволеная, асцярожна падняла гаршчок з фікусам. Хаваючы яго ад зласлівай мяцеліцы, хутка панесла дадому.

**Ганна АТРОШЧАНКА**

■

■ Рабі як мы

# ВУЛІЧНЫЯ ТРЭНАЖОРЫ ЗАМЕСТ ТЭЛЕВІЗАРА

### Як у Зялёнцы бацькоў і дзяцей да здаровага ладу жыцця прывучаюць

**Пару гадоў таму Зялёнка была звычайным аграгарадком. Насельніцтва меншала, а тым маладым сем'ям, якія заставаліся жыць на вёсцы, не было дзе адпачыць. Сельская ўлада разумела: трэба нешта рабіць. І выйграла для вяскоўцаў вулічныя трэнажоры — па праграме Беларускага Чырвонага Крыжа па здаровым ладзе жыцця. Цяпер на выхадных, пакуль дзеці катаюцца з горкі і пякуць пясочныя кулічы, бацькі качаюць прэс і круцяць педалі.**



Старшыня сельвыканкама Ала ЛАПАНОВІЧ дапамагае Любові Міхайлаўне працаваць на трэнажоры.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Многім сельсаветам прапаноўвалі паўдзельнічаць у конкурсе. Усе паадмаўляліся. А мы ўчапіліся за гэту ідэю, — усміхаецца **старшыня Зялёнкаўскага сельвыканкама Ала ЛАПАНОВІЧ,** пакуль ідзём да пляцоўкі. — Думалі: чаго аграгарадку не хапае? І прыйшлі да высновы, што дарослым і дзецям няма дзе праводзіць вольны час разам. Савецкая пляцоўка ўжо прыйшла ў непрыгоднасць, а на новую сродкаў няма. Вось і падалі заяўку.

Ала Пятроўна ўспамінае, што па праграме Чырвонага Крыжа прапаноўвалі на выбар і іншыя праекты рэалізаваць, напрыклад па барацьбе з п'янствам. Але хіба яго перамажаш, уздыхае жанчына. Калі чалавек сам не хоча кінуць піць, ніхто яго не пераканае.

Месца для пляцоўкі выбралі ў школьным двары. «У школе вартаўнікі ўвесь час ёсць. А раптам вандалізм, ведаеце», — тлумачыць Ала Пятроўна.

Дзіцячую пляцоўку адкрылі ў жніўні мінулага года, дарослую — у кастрычніку. Каб выйграць фінансаванне, кажуць, трэба было пастарацца. Даказаць, што аграгарадку гэта сапраўды патрэбна і будзе працаваць.

— У Зялёнцы зарэгістравана 442 чалавекі. Мы ў прынцыпе не стары аграгарадок. У школу і дзіцячы садок сто чалавек ходзіць, — апісвае сітуацыю старшыня сельвыканкама.

Сёння з надвор'ем пашанцавала. Перадавалі, што пойдуць дажджы, а ўвесь дзень пячэ сонца. У спартыўнай зале пад адкрытым небам — такой нават гараджане пазайздросцяць — сабралася дзятва і мамы ў дэкрэце. Астатнія дарослыя пакуль на працы. Затое па выхадных тут усё кіпіць.

— Ала Пятроўна, пакажыце клас! — «бяруць на слабо» вяскоўцы.

Ала Пятроўна не тушуецца. Нездарма працуе на вуліцы Маладзёжнай — бойка ўскоквае на эліпсоід. А як — трэба ж падаваць прыклад!

— Мы ж спачатку не ведалі, як гэтымі трэнажорамі карыстацца. Прыехаў хлопец, паказаў, растлумачыў, дзе якая група мышцаў задзейнічана, — расказвае старшыня.

На пляцоўку яна і ўнучку Леру водзіць — тая якраз прыехала з Полацка да бабулі на канікулы. Учора, прызнаецца Ала Пятроўна, яны толькі ў адзінаццаць вечара дадому прыйшлі, у бадмінтон гулялі.

З унучкай на трэнажорах сёння і пенсіянерка Любоў Міхайлаўна Кудзеля. У мінулым гэта энергічная жанчына — старшыня сельскага Савета, а цяпер — актыўны член ініцыятыўнай групы «Здаровая Зялёнка». Сама прэс качае і іншым спуску не дае.

— Ты ў сваю абедзенную гадзіну не пончыкі еш, а сюды прыбягай, — настаўляе кагосьці з дзяўчат Любоў Міхайлаўна.

Непадалёк мацуе біцэпс малады дырэктар Дома культуры Аляксей Зуеў. Такой спартпляцоўкі, прызнаецца 28-гадовы вясковец, даўно не хапала. «Сам па сабе ведаю: калі няма месца, куды можаш прыходзіць займацца, ты і лад жыцця вядзеш пасіўны», — кажа хлопец.

Чырвоны Крыж закупіў таксама гімнастычныя палкі, дыванкі для аэробікі ў Дом культуры. Велатрэнажор паставіў. Так што ёсць дзе займацца ў асенне-зімні перыяд. Павесілі ў зале і наглядную агітацыю, у прыватнасці плакаты па здаровым харчаванні.

— Я прывучыў сябе, што перад сняданкам, абедам і вячэрай трэба выпіваць шклянку вады. Гэта робіць арганізм больш устойлівым да інфекцый, паляпшае страваванне і не дае пераесці, — дзеліцца Аляксей. — Хацелася б, каб больш людзей далучалася да актыўнага ладу жыцця. Каб усвядомілі, што пра здароўе трэба клапаціцца не толькі тады, калі захварэюць, а праводзілі прафілактыку.

Зімой удзельнікі клуба «Здаровая Зялёнка» раз на тыдзень наведвалі басейн. Ездзілі на аквааэробіку ў Расоны, за 30 кіламетраў. Два разы на тыдзень праводзіліся заняткі па танцах. У аграгарадку рэгулярна праходзяць Дні здароўя, на якія збіраецца каля сотні чалавек. І вынікі такой актыўнасці ўжо ёсць.

— У нас адкрыты ўрок фізкультуры быў. Нашы хлопцы і дзяўчаты паказалі, што ўмеюць рабіць, дык не ўсе фізрукі так могуць. А на Дні здароўя ў Полацку каманда аграгарадка заняла першае месца, — хваліцца Ала Пятроўна.

Галоўнае ж дасягненне, што вясковыя сем'і адпачываюць нарэшце не толькі на канапе перад тэлевізарам. І падлеткі добры прыклад пераймаюць. «Раней нашы дзеці на аўтобусным прыпынку ўвечары сядзелі, — прызнаюцца ў Зялёнцы. — А цяпер на пляцоўцы збіраюцца. Праводзяць час у здаровай абстаноўцы».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

*Полацкі раён*

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# Свойскі мядзведзь



Мой дзядуля — Міхась Шатроў — той чалавек, каго называюць «старой загартоўкі»: заўсёды сабраны, бадзёры і, нягледзячы на тое, што яго ўзрост набліжаецца да 90 гадоў, на дзіва энергічны. Я люблю пераглядаць сямейны альбом, дзе нямала старых здымкаў: вось мой дзядуля, зусім маленькі, стаіць з татам, мамай і брацікам, а вось ён ужо ў Іркуцкім авіяцыйным ваенным вучылішчы рыхтуецца да палёту і свайго першага скачка з парашутам. Але самы незвычайны здымак звязаны з яго юнацтвам. На ім — дзядуля, яго брат і... мядзведзь сядзяць на адным дрэве. Фота зроблена ў Томскай вобласці, у Сібіры, дзе і вырас дзядуля. Умовы ў тых краях былі суровыя: вёсачка, якой сёння ўжо няма на карце, размяшчалася сярод тайгі. Аднойчы дзядуля з сям'ёй падабралі ў лесе медзведзяня. Паляўнічыя забілі мядзведзіцу, а яе дзіця засталося адно. Вырашана было ўзяць яго дадому. Адмысловая дыета, выхаванне — і мядзведзь быў практычна ручным. Ён быў ахоўнікам хаты — абараняў сям'ю ад дзікіх жывёл, якія маглі выйсці з лесу. У мядзведзя быў свой домік у двары — яго, вядома, цяжка параўнаць з сабачай будкай, але па сутнасці ідэя была падобная. Сям'я дзядулі была не адзінай, хто падбіраў медзведзянят, тады гэта была справа калі не звыклая, то не настолькі незвычайная, як сёння.

Сваё жыццё дзядуля звязаў з авіяцыяй, быў ваенным лётчыкам. У сям'і ён узор для падрастаючага мужчынскага пакалення. Мы ганарымся ім, з задавальненнем слухаем гісторыі з яго сібірскага дзяцінства і пераглядаем гэтыя старыя здымкі зноў і зноў.

**Наталля ТОЛКАЧ,** *г. Ліда*

■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Ці чулі?

# МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ ЗАГАВАРЫЎ ПА-БЕЛАРУСКУ

**У суботу мне пашчасціла паглядзець у кінатэатры «Масква» французскі мультфільм «Маленькі прынц» у беларускай агучцы. Пасля прагляду яшчэ хвілін 20 стаяла ў чарзе па кнігу Антуана дэ Сент-Экзюперы на роднай мове. Дадому я вярнулася шчаслівая, ажно з трыма асобнікамі: для сябе, хрэсніцы і пляменніка.**



Малюнак беларускай мастачкі Ганны СІЛІВОНЧЫК.

Пераклады «Маленькага прынца» існуюць на 300 мовах і дыялектах. Па-беларуску гэтая кніга была выдадзена ў 1989-м у перакладзе Ніны Мацяш. Цяпер толькі некалькі экзэмпляраў з таго тыражу даступныя для чытачоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Таму ў межах серыі «Добрая кніга» пры падтрымцы кампаніі velcom з'явілася перавыданне «Маленькага прынца» на беларускай мове. Значную частку тыражу плануецца перадаць у школьныя бібліятэкі.

Калі я набывала «Маленькага прынца», хтосьці з чаргі запытаўся, ці будуць кнігі прадавацца ў кніжных крамах. На што прадавец сказаў: «Наўрад, бо ўвесь тыраж, хутчэй за ўсё, разляціцца, як гарачыя піражкі, на паказах мультфільма». Дарэчы, персанажы апошняга загаварылі па-беларуску галасамі такіх акцёраў, як Ганна Хітрык, Святлана Цімохіна, Зміцер Бейнарт-Саладуха, Павел Харланчук, Сяргей Жбанкоў, Уладзімір Глотаў.

Акрамя Мінска, сустрэчы з «Маленькім прынцам» чакаюць жыхароў некаторых абласных цэнтраў. За ліпень і жнівень арганізатары плануюць паказаць мультфільм у Гродне, Магілёве і Гомелі. Наступныя паказы ў Мінску плануюць у канцы жніўня — пачатку верасня. Каб не прапусціць іх, можна пакінуць свае даныя на kinakong.by/poll.

### Цікавыя факты пра Маленькага прынца і яго аўтара

- Знакаміты пісьменнік і авіятар нарадзіўся 29 чэрвеня 1900 года. Паказы мультфільма якраз і прымеркаваныя да дня нараджэння Антуана дэ Сент-Экзюперы.
- «Маленькі прынц» — трэцяя па колькасці перакладаў кніга ў свеце пасля Бібліі і Карана. У красавіку 2017 года выйшаў пераклад на трохсотую мову: хасанія (на ёй размаўляюць у Заходняй Сахары). Гэтая мова, не вельмі вядомая шырокай публіцы, мела сімвалічнае значэнне для Антуана дэ Сент-Экзюперы, таму што менавіта на поўдні Марока, дзе гавораць на хасаніі, аўтар знаходзіў казкі чэрпаў натхненне.
- Казка, апублікаваная ў 1943 годзе, была прададзеная ў свеце тыражом у больш як 200 мільёнаў асобнікаў.
- Леон Верт, якому прысвечана кніга, прачытаў яе толькі праз 5 месяцаў пасля смерці аўтара.
- Знакаміты афарызм з кнігі: «Відушчае толькі сэрца. Самага галоўнага вачыма не ўбачыш», — перапісваўся і мяняўся Экзюперы больш за 15 разоў.

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■

# «Я ЗАЎСЁДЫ МАРЫЛА БЫЦЬ МАМАЙ»



## «НІКОЛІ НЕ ДУМАЛА ПРА АБОРТ»

— У свеце балерын — шматдзетных мам адзінкі, — расказвае Ірына. — Вельмі часта жанчыны балета не рашаюцца нават на адно дзіця і адкладаюць асабістае жыццё «на потым». Узнікае страх прапусціць вялікі тэрмін, выйсці з формы. І наогул балет вельмі моцна зацягвае, ад яго складана адарвацца. Асабліва ў той час, калі кар'ера ідзе ў рост. У гэты перыяд пакінуць усе свае мары і амбіцыі і пераключыцца на нараджэнне дзіцяці вельмі складана.

У нас тут ужо прывыклі да маёй гісторыі *(усміхаецца)*. Але калі знаёмлюся з кімсьці, то, вядома, заўважаю некаторае здзіўленне. Іншым і з адным дзіцем цяжка, а тут тры... Так, бывае складана. Але трэба пацярпець, пачакаць. Калі дзеткі маленькія, то, вядома, і па начах недасыпаеш, і перад спектаклем не дадуць табе адпачыць, але яны растуць, і з часам з імі можна дамовіцца.

**«За сынам я назірала з 3—4 гадоў: як ён скача, як гнецца, ці можа сесці на шпагат. Але ў яго, на жаль, не было даных. А ламаць дзіця і ўнушаць яму, што ты ўсё роўна павінен гэтым займацца, бо ў цябе мама балерына, я не хацела».**

Аднойчы я зразумела: не змагу зрабіць аборт, мне нават думаць пра гэта страшна. Калі жанчыне далася магчымасць стаць маці, то значыць, так трэба. І нават калі яна не планавала гэтае дзіця, ёй складана і страшна, усё адно не мае права яго забіць. Я падыходжу да гэтага па-філасофску і лічу, што ў кожнага, хто нараджаецца на свет, ёсць свая місія.

## «МАТУЛЯ — МОЙ АНЁЛ-АХОЎНІК»

— Мая мама — настаўнік пачатковых класаў і наогул актывістка па жыцці. Яна заўсёды хацела, каб мы з братам паспрабавалі сябе ў розных сферах. Калі мне было 10 гадоў, мама выпадкова наткнулася на абʼяву ў газеце аб наборы ў харэаграфічны каледж. Хоць я не займалася танцамі тады наогул і балет бачыла толькі па тэлевізары, мы вырашылі паспрабаваць. І я паступіла.

Потым была вучоба — вельмі складаная маральна. Для мяне з'ехаць ад бацькоў, адарвацца ад мамы ўжо было цяжка. Але яна заўсёды мяне падтрымлівала: прыязджала да мяне, дапамагала з вучобай, начавала са мной у інтэрнаце. Мама побач і цяпер. Яе падтрымку я адчуваю ўсё сваё жыццё і разумею: мамам трэба давяраць, яны дрэннага не параяць.

Не думала, што кар'ера складзецца так удала. Калі вучылася, у нас былі свае лідары — таленавітыя дзяўчаткі, якім усё давалася проста. Я займалася і не добра, і не дрэнна. Але ў мяне не было той вялікай мары стаць вядомай балерынай. А менавіта гэта і дапамагае ўпарта працаваць. Напэўна, я была больш жанчынай, чым балерынай. Ужо ў 15—16 гадоў я думала пра тое, што аднойчы ў мяне будзе свой дом і шмат дзяцей. Але потым, пасля нараджэння сына, мяне сталі заўважаць у тэатры. Я адчула сваю сілу і пачала думаць, што, магчыма, змагла б больш. Тады з'явілася мара станцаваць «Жызэль», у «Шчаўкунку». Увесь гэты час, нават калі я ў сабе сумнявалася, у мяне верыла мая мама. Яна казала: «Ты паспрабуй, а раптам атрымаецца». Матуля — мой анёл-ахоўнік.

## «У ТЭАТРЫ НЕ ВЕДАЛІ, ШТО Я ЦЯЖАРНАЯ ТРЭЦІ РАЗ»

— Калі была цяжарная трэці раз, дачкой Кацяй, у тэатры не ведалі аж да пятага месяца, — успамінае Ірына. — Пры гэтым я працягвала танцаваць. Заўсёды была пад наглядам урача, які казаў, што для дзіцяці мае фізічныя нагрузкі нават карысныя. Дрэнна я магу зрабіць толькі сабе, так як звязкі становяцца слабымі.

Найбольш марудна я прыходзіла ў форму пасля першых родаў. Тады з Максімам прапусціла каля дзевяці месяцаў. А з Ксюшай усё было інакш: я займалася ўжо праз паўтара месяца пасля нараджэння дачкі, а праз тры — выступала на сцэне. Было складана, у сваю ранейшую форму я яшчэ не прыйшла. Я карміла грудзямі, і калі разумела, што падчас спектакля з'яўляецца малако, становіцца цяжка танцаваць, сцэджвала яго за сцэнай.

Балетны век вельмі кароткі, каля 20 гадоў працы. І калі праседзець з кожны дзіцем па тры гады, то няма сэнсу ісці ў гэтую прафесію.

## «СЫН ПАВІНЕН БЫЎ ВЫБРАЦЬ СВОЙ ШЛЯХ САМ»

— Калі ў мяне быў толькі Максім, ён хадзіў у школу і было, вядома ж, цяжка. Тэатр забіраў вельмі шмат часу, але праца была цікавая, мяне зацягвала. Я нарадзіла сына ў 20, таму, зразумела, мне хацелася працаваць. І я дамаўлялася з Максімам, што ён павінен быць самастойным. Ён прывык вучыць вершы толькі са мной, гісторыю — таксама са мной. У яго слыхавая памяць: я чытаю, і ён запамінае. Мы рабілі гэтыя ўрокі з ім позна ўвечары, калі я вярталася дамоў пасля спектакляў.



Я заўсёды магла здацца на сына. І не толькі ў вучобе. Перад выхадам з дому ён заўсёды правяраў, ці ўсё выключана, закрыта. Ён разумеў, што мама зарабляе грошы, што трэба некаторыя рэчы рабіць самому. Так, у мяне былі згрызоты сумлення, што я не сяджу з ім цэлымі вечарамі над урокамі, што ён не выдатнік. Але потым зразумела, што так нават лепш. Максім — мужчына, ён павінен быць самастойным і адказным. Сёння я дакладна ведаю: ён не прападзе ў жыцці.

Ці думала я пра тое, каб мае дзеці таксама звязалі сваё жыццё з балетам? Так. За сынам я назірала з 3—4 гадоў: як ён скача, як гнецца, ці можа сесці на шпагат. Але ў яго, на жаль, не было даных. А ламаць дзіця і ўнушаць яму, што ты ўсё роўна павінен гэтым займацца, бо ў цябе мама балерына, я не хацела. Максім павінен быў выбраць свой шлях сам. Зараз ён студэнт Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Ксюшы, ёй на днях споўнілася 6 гадоў, усё даецца лёгка. Фізічна яна створана для балета. Але я таксама даю дачцэ права выбару: яна займаецца маляваннем, танцуе, спявае. Быў калісьці перыяд, калі яна праводзіла ў тэатры разам са мной шмат часу. Перагледзела амаль увесь рэпертуар, добра ведае балетныя спектаклі. Нават зараз, калі пачуе музыку, можа з ходу вызначыць, з якой яна пастаноўкі. Да таго, каб зразумець оперу і балет, трэба ісці паступова. Пачынаць з лёгкага для ўспрымання спектакля і рухацца далей. Я вельмі хвалявалася, ці зразумее Ксюша оперу. Ёй вельмі спадабаўся «Турандот», бо ён як казка, а вось больш філасофскія пастаноўкі пакуль не прыцягваюць.

Старэйшы сын таксама часта бываў у мяне на працы. Памятаю, ён вельмі любіў усіх смяшыць. Быў выпадак, Максіму тады споўнілася 4 гады, ён сядзеў у нас на рэпетыцыі, якую вёў Юрый Траян. Раптам устаў, падышоў да яго і спытаў: «А можна я да вас на каленкі сяду?» Юрый Антонавіч сказаў: «Ну, сядай». Максім сядзеў, сачыў за рэпетыцыяй і заўважыў, што канцэртмайстар уступае пасля кожнага «І-і-і», якому папярэднічаюць заўвагі кіраўніка балетнай трупы. Сын дачакаўся, пакуль Юрый Антонавіч зноў скажа сваё слова, і сам закрычаў: «І-і-і». Мы вельмі смяяліся...

### Сакрэт добрай формы ад балерыны Ірыны Яромкінай:

— У балерын, як і сярод усіх жанчын, ёсць тыя, хто схільны да паўнаты. І мне здаецца, што тое, што я зараз скажу, адносіцца да нас усіх. Калі ў мяне будзе сядзячая праца, я буду сытна есці тры разы на дзень, злоўжываць салодкім і мучным, арганізм, вядома, пачне набіраць вагу. Зніжаецца каларыйнасць ежы — ты худнееш. Але да гэтага трэба дадаць і фізічную нагрузку. У балерын яе шмат. Таму ў свой рацыён мы дадаём бялок, агародніну, складаныя вугляводы. Але ва ўсім патрэбна мера.

Цяпер я проста імкнуся слухаць свой арганізм. І дзецям сваім кажу: «Не хочаш — не еш». Часам мы, напрыклад, купляем марозіва толькі таму, што цяпер горача, а яно халоднае. А калі прыслухацца да арганізма, то, магчыма, вам яго і не хочацца.

**«Мама побач і цяпер. Яе падтрымку я адчуваю ўсё сваё жыццё і разумею: мамам трэба давяраць, яны дрэннага не параяць».**

## «КАЛІ МЫ РАЗАМ, НАМ НІКОЛІ НЕ БЫВАЕ СУМНА»

— Як толькі з'яўляецца вольны час, я праводжу яго з дзецьмі. Нядаўна з дочкамі адпачывалі ў аквапарку — вельмі спадабалася. З Ксюшай зімой хадзілі на каток, часам бываем у цырку. Кожны вечар перад сном катаемся на веласіпедах. Стане цёпла — будзем купацца ў возеры. А яшчэ мы можам проста правалянца ўвесь вечар дома. Уключаем мульцікі, бяром смачную ежу, забаўляемся. Калі мы ўсе разам, нам ніколі не бывае сумна.

Нам вельмі пашанцавала: у нас прыватны дом і свой участак. Для дзяцей ёсць вялікая пляцоўка. Я магу быць дома, займацца справамі, а дзеці будуць гуляць на двары, але я за іх спакойная. Яны побач, іх заўсёды можна бачыць у акно. Вось сёння ўсталюем батут — падарунак Ксюшы на дзень нараджэння. Будзе весела!

Безумоўна, я вельмі сумую па іх, калі з'язджаю на гастролі. Але цяпер гэта не праблема: заўсёды быць на сувязі. Дзеці застаюцца з маёй маці, і я за іх спакойная.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ТОЛЬКІ ПРОСТЫЯ СЛОВЫ ДЫ ПРОСТЫЯ РЭЧЫ




## «Дызайн сваёй кашулі Паша распрацоўваў сам»

***— Чыя была ідэя зладзіць менавіта беларускае вяселле? І хто з вас займаўся яго арганізацыяй?***

**Паша:** Мы з Дашай размаўляем па-беларуску. Любім і шануем сваю культуру і традыцыі. Таму нават не ўзнікала пытанняў наконт таго, што вяселле будзе з беларускім каларытам.

**Даша:** Падчас падрыхтоўкі мы падзялілі задачы: Паша займаўся планаваннем нашай вандроўкі па Непале, а я занялася вяселлем. Пры гэтым улічвала ўсе пажаданні каханага. Ён адразу сказаў, што не хоча ніякіх «дзвюх гарачых», доўгіх застолляў і «А эта свадьба пела и плясала...».

**Паша:** Толькі простыя словы ды простыя рэчы. Я хацеў, каб усё было нязмушана, весела, цёпла і ўтульна.

**Даша:** Разам з тым нам не хацелася занадта традыцыйнага свята. Не было ў нас ні сала, ні гармоніка. Паша вельмі любіць віяланчэлі, таму менавіта такіх музыкаў мы запрасілі на роспіс.

**Паша:** Музыкі зрабілі нам сюрпрыз, сыгралі Купалінку, я гэтую песню вельмі люблю. Нават праслязіўся. Гэта было вельмі прыгожа, кранальна.

**Даша:** Паша добра малюе, таму самастойна прыдумаў дызайн сваёй кашулі.

**Паша:** Я хацеў, каб яна была ўрачыстая, але пры гэтым не надта фанабэрыстая, як, ведаеце, бываюць такія ўзоры на ўсе грудзі. Таму папрасіў, каб мне на белай ільняной кашулі вышылі арнамент атласнымі белымі ніткамі, а чырвоны колер быў прыхаваны ўнутры каўняра. Ёсць у мяне сайт (spampavac.by), куды я заліў вектарныя выявы беларускіх арнаментаў. Змалёўваў іх з фота старых кашуль, што знаходзіў у інтэрнэце. Адтуль і выбраў сабе арнамент на вяселле. *(Дарэчы, Пашын сайт карыстаецца папулярнасцю. Яго вектарнымі малюнкамі аздабляюць машыны, вышымайкі, меню ў рэстаранах, форму для футбольнай зборнай. — **Аўт.**)*

**Даша:** Кашулю для Пашы і строі для мяне і нашых матуль шыла беларуская дызайнерка Настасся Фальковіч. Яна да справы з душой падышла. У матуль былі льняныя строі. У мяне — атласная сукенка з вышытымі кветкамі льну. А на поясе — галубкі, як сімвал узаемнага кахання.

**Паша:** Татаў жа мы павялі ў краму і набылі ім вышыванкі.

***— Як вам удалося ўгаварыць адзецца па-беларуску сваіх бацькоў?***

**Даша:** Яны самі моцна хацелі нас падтрымаць, пыталіся — як лепш адзецца, каб адпавядаць стылістыцы? Жывуць бацькі не ў Мінску. Наўрад ці там можна знайсці сучасны строй з нацыянальным каларытам. Таму мы прапанавалі дапамогу.

**Паша:** Пасля дадалі гэты тэкст у запрашэнні. «Свята ладзіцца амаль у лесе. Апранайцеся так, каб было зручна: джынсы і вышыванка будзе самае тое».

**Даша:** Некаторыя сябры адпісваліся: «Даўно хацелі набыць вышыванкі, а тут такая нагода. Дзякуй». Хлопцам жа, якім у звычайнай кашулі зручней, мы прапанавалі гальштукі-бабачкі з вышыўкай. І яны з задавальненнем іх надзелі.

## «З бабулінымі дзяругамі любое свята будзе душэўным»

**Даша:** Нам казалі: «Госці не будуць танцаваць пад вашу музыку». Але мы ўсё адно вырашылі паспрабаваць і запрасілі гурт Ву Cry. Яны спявалі толькі па-беларуску. Не вядомыя нікому песні. Але ад музыкаў сыходзіла такая неймаверная энергетыка, што пад іх скакалі ўсе — і старыя, і малыя. Акрамя таго, на свяце ў нас быў майстар-клас па беларускіх танцах ад тэатра «Фламея». Нейкі код беларускасці, напэўна, у нас у галаве застаўся, усім хацелася развучваць народныя рухі. Не было такіх, хто б сказаў: «Вы тут скачыце, а я збоку пасяджу-пагляджу».

***— Мяне вельмі ўразіла, што запрашэнні для друкавалі на бабуліным ільне, якому не менш як 50 гадоў.***

**Даша:** Хацелася прыдумаць нейкую новую форму запрашэння. Спыніліся з дызайнерам на льне. Падчас размовы з мамай высветлілася, што ў вёсцы на гарышчы дакладна ёсць адрэз нябеленага. Бабуля Ніна вельмі ўсцешылася, калі сказалі, што будзем мець гонар скарыстаць яе рэчы. Падарыла Пашу пояс для строю, які сама калісьці ткала. А потым са слязамі радасці аддала дзяругі, ручнікі, набажнікі.

**Паша:** Мы паказалі ўвесь гэты скарб нашаму дэкаратару. Кацярына Мытнік прыгожа выкарыстала яго ў аздабленні аркі, сталоў. Мы не хацелі нічога набываць, па максімуму выкарыстоўвалі сваё. Бо ў такіх рэчах, зробленых рукамі, з пяшчотай, неверагодная энергетыка, з імі любое свята атрымаецца душэўным.

**Даша:** Кавалак ільну я адрэзала для запрашэнняў. Тэкст і арнамент на ім мы надрукавалі ў тыпаграфіі. І Паша ад рукі, паколькі ён займаўся каліграфіяй, падпісаў звароты да гасцей.

***— А праўда, што вашыя госці стараліся гаварыць па-беларуску?***

**Паша:** Размаўлялі дзе на трасянцы, дзе на мове, у каго як атрымлівалася.

**Даша:** Вядучы ў нас быў беларускамоўны Усевалад Сцебурака. Ён не толькі дапамог сарыентавацца ў асаблівасцях беларускіх вяселляў, але і задаваў тон святу. Мая сяброўка, шаферка, у гэты дзень размаўляла па-беларуску. Я разумела, колькі намаганняў ёй трэба было прыкласці. І была моцна ўсцешаная яе ўчынкам. Дзядзькі родныя ніколі не размаўляюць па-беларуску. Але ў гэты дзень «лупілі» на трасянцы. Гэта было так нечакана і так прыемна, бо бачыш, што яны ідуць насустрач, не баяцца паспрабаваць нешта новае.

**Паша:** Я кніжку пачаў чытаць пра чалавека і сітуацыю. Дык там пішацца, што паводзіны, як правіла, залежаць ад абставін. Таму калі людзей змясціць у такія ўмовы, дзе ім будзе зручна адзявацца і гаварыць па-беларуску, яны будуць гэта рабіць. Чаму ў нас большасць беларусаў размаўляе па-руску? Яны робяць так, як сітуацыя вымагае ад іх. Так прасцей і зручней. Мы з Дашай паказалі на ўласным прыкладзе, што ўсё ў нашых руках.



**«Бабуля вельмі ўсцешылася, калі сказалі, што будзем мець гонар скарыстаць яе рэчы. Падарыла Пашу пояс для строю, які сама калісьці ткала. А потым са слязамі радасці аддала дзяругі, ручнікі, набажнікі».**



Фота Сяргея ПІЛІПОВІЧА.

## «Букецік нявесты мы пакінулі Якубу Коласу»

***— Як кожны з вас пачаў штодзённа размаўляць на роднай мове?***

**Паша:** У школе, дзе я вучыўся, размаўляў па-беларуску толькі адзін настаўнік беларускай мовы і літаратуры. І то на яго ўсе так пазіралі... У яго была мянушка «Добры Дзень». Я таксама думаў перайсці на мову, але так і не адважыўся. Пасля школы паехаў вучыцца ў Мінск. Дома я звычайна на трасянцы «валіў», а тут трэба ўжо нейкі выбар рабіць, як размаўляць, па-беларуску ці па-руску. А ў мяне раней былі праблемы з камунікацыяй. Думаю, буду па-руску, так прасцей паразумецца з людзьмі. Але ўсе свае нататкі і перапіску працягваў весці па-беларуску. А потым вырашыў, колькі можна адкладаць, калі я хачу нешта змяніць у нашай краіне, то трэба пачынаць з сябе. З таго вечара я перайшоў на родную мову і не маю патрэбы ісці на кампраміс з уласным сумленнем.

**Даша:** Мне пашанцавала больш, я вучылася ў сапраўднай беларускамоўнай школе. Але паколькі ва ўніверсітэце ўсе прадметы выкладаліся па-руску, размаўляла на рускай мове. На другім курсе стала рыхтавацца да канферэнцыі па паліталогіі. У мяне была тэма «Беларуская нацыянальная ідэя». Я ж, ведома, прэзентавала па-беларуску. І каб не «бэкаць-мэкаць», перайшла за тыдзень да канферэнцыі на беларускую мову. Падчас гэтага эксперыменту я зрабіла для сябе шмат высноў. Першая і галоўная: людзі больш уважліва цябе слухаюць, бо стараюцца зразумець і перакласці. Па-другое, на беларускамоўнага чалавека больш звяртаюць увагі. Ён вылучаецца і не падобны да астатніх. А кожная дзяўчына, а тым больш будучы піяр-менеджар, ну проста марыць, каб яе не блыталі ні з кім. Па-трэцяе, за тыя паўтара года, што не карысталася роднай мовай, я пачала яе забывацца. Мне стала страшна, што магу пазбавіцца таго, што ў мяне было. Таму вырашыла працягнуць свой эксперымент. І ніколькі не пашкадавала. Мова дапамагла мне знайсці самую першую працу. Я працавала на фестывалі беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі «Аднак». Я ўдзячна мове за мужа. Бо наўрад ці ён спыніўся б на рускамоўнай.

***— Калі б зараз можна было другі раз зладзіць вяселле, штосьці б удасканалілі, ці пакінулі б усё як было?***

**Паша:** Даша прафесійны арганізатар свят. Без жартаў, я праўда так лічу. Настолькі ўсё было цёпла і душэўна. Нават весялей, чым мы ўяўлялі.

**Даша:** Я толькі загадзя папярэдзіла б гасцей, каб яны не везлі кветкі. Бо мы праз два дні адляталі і любавацца імі не было як.

**Паша:** А букецік маладой па дарозе ў аэрапорт мы пакінулі Якубу Коласу. Мы там, недалёка ад помніка, жывём. Пакідаць кветкі ў кватэры, каб яны засохлі, не хацелася...

***— Знаёмая расказвала, што іх сябры, пакуль рыхтаваліся да вяселля, ледзь не развяліся...***

**Даша:** У нас атрымліваецца дамаўляцца.

**Паша:** У тым ліку і дзякуючы гутаркам па чацвяргах.

**Даша:** Паша прачытаў цікавы артыкул. Там пішацца, што людзі часта разыходзяцца, бо проста адзін з адным не размаўляюць. Пасля гэтага мы вырашылі шточацвер ладзіць сямейную гутарку. Спачатку кажам, за што мы адно аднаму ўдзячныя. Пасля плануем сумеснае праводзенне часу. Потым абмяркоўваем зоны нашай адказнасці: хто што робіць і ў які тэрмін гэта павінна быць выканана. Каб разумець, што каму не падабаецца, абавязкова агучваем праблемныя зоны. Спачатку доўга іх абмяркоўвалі. Але цяпер наша сямейная нарада на 90% складаецца з таго, што мы кажам, за што мы ўдзячныя адно аднаму.

**Паша:** Я вельмі раю такія размовы практыкаваць іншым парам. Бо яны вучаць адкрытасці і камунікацыі ў сям'і. Вельмі часта людзі чакаюць, што іх павінны зразумець проста так, без слоў. Яны не выказваюць свае жаданні, а калі і выказваюць, то нейкімі намёкамі. І потым крыўдзяцца, калі іх не разумеюць.

**Даша:** Перад вяселлем сяброўкі дзівіліся: «Ты не ведаеш, які ў цябе будзе пярсцёнак? Як ты не хадзіла з Пашам яго выбіраць?» Кажу, як рабіў прапанову, вельмі прыгожы набыў, я яму давяраю.

**Паша:** Кансультант у краме таксама здзівілася, што я адзін прыйшоў. Пытаецца: «А якія падабаюцца вашай каханай?»

**Даша:** «Як якія? Тыя, што я выберу,» — не раздумваючы адказаў Паша *(смяецца)*. Любыя адносіны трымаюцца на даверы. Таму не бойцеся размяркоўваць абавязкі і давяраць свайму партнёру. Вы прыемна здзівіцеся вынікам, а ўсё таму, што гэта для вас робіць чалавек, які вас моцна кахае.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже следующих объектов недвижимого имущества:

**Лот №1: двухэтажное кирпичное здание «Универмаг»**, общей площадью **724,2 кв. м**, инв. №630/С-63424, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700003000225 (предоставлен на праве постоянного пользования), площадью **0,1558 га**, по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, ул. Виленская, 2**.

Объект находится в стадии реконструкции. Реконструкция объекта не завершена.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (река Вязынка, река Гуйка, канал Вилейско-Минской водной системы) – площадь 0,1558 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт – площадь 0,0125 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **342 300,00** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 34 230,00 бел. руб.).

**Лот №2: здание магазина «Хлебный»**, общей площадью **61,3 кв. м**, инв. №630/С-70118, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700002000125 (предоставлен на праве аренды), площадью **0,0121 га**, по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 9**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона реки Вязынка и канала Вилейско-Минской водной системы вне прибрежной полосы – площадь 0,0121 га. Указанное недвижимое имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона или продавца).

Начальная цена с НДС (20%) – **36 394,06** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 3 639,00 бел. руб.). Указанное недвижимое имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона или продавца).

**Лот №3: здание магазина №56**, общей площадью **114,6 кв. м**, инв. №630/С-76929, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623855700002000146 (предоставлен на праве аренды), площадью **0,0228 га**, по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, пл. Гастелло, 17**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (река Вязынка) – площадь 0,0228 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **51 126,88** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 5 112,00 бел. руб.).

**Лот №4: здание магазина**, общей площадью **490,9 кв. м**, инв. №630/С-74071, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623883505601000366 (предоставлен на праве аренды), площадью **0,1259 га**, по адресу: **Минская область, Молодечненский район, Полочанский с/с, аг. Полочаны, ул. Вокзальная, 7.**

Начальная цена с НДС (20%) – **147 959,64** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 14 795,00 бел. руб.).

**Лот №5: здание магазина №10**, общей площадью **89,9 кв. м**, инв. №630/С-74362, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623882006601000038, площадью **0,0500 га**, по адресу: **Минская область, Молодечненский район, Лебедевский с/с, д. Малая Борковщина**.

На земельном участке имеются ограничения: охранная зона придорожных полос автомобильных дорог – площадь 0,0500 га.

Начальная цена с НДС (20%) – **6 850,00** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 685,00 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с 3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: по лоту №1 в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№2,3 – 5 (пяти) процентов, по лоту №4 – 4 (четырех) процентов и по лоту №5 – 10 (десяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **31.07.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.07.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Лиозненское районное потребительское общество, г. п. Лиозно, ул. Ленина, 82, тел. (02138) 4-12-07.

Лот №1. Капитальное строение с инв. №202/С-76449 площадью 1027,8 кв. м, наименование: здание склада, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Лиозненский р-н, г. п. Лиозно, ул. Добромыслянская, д. 28А, на зем. участке №223055100001002438 площадью 1,0143 га. **Нач. цена:** 59 121,60 руб. с НДС. **Задаток:** 5 912,16 руб. **Шаг аукциона:** 2 956,08 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 02.08.2017 в 11.00 по адресу: г. п. Лиозно, ул. Ленина, 82, в Лиозненском районном потребительском обществе. Срок внесения задатка и подачи документов: с 04.07.2017 с 8.30 по 01.08.2017 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: возместить затраты по оценке имущества, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Ранее опубликованные извещения: газеты «Звязда» 16.05.2017, «Сцяг перамогі» 16.05.2017, «Витебские вести» 16.05.2017.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 20.09.2011 №301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа, подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ, подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на **р/с 3012078870010 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК 153001117 (с 04.07.2017: р/с BY93MTBK30120001093300066782, IBAN MTBKBY22), УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**. Организатор аукциона вправе не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | Пуховичское районное потребительское общество, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, 73 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь, кв. м | Инв. номер | Адрес |
| **Месторасположение**: **Минская обл., Пуховичский р-н** | | | | |
| **Лот №1** | | | | |
| **Магазин** | Здание специализированное розничной торговли | 89,6 | 602/С-13783 | Пережирский с/с, д. Равнополье, ул. Школьная, 2А |
| Составные части и принадлежности: два сарая | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл **0,0642 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания зданий магазина (срок действия по 26.05.2065) с установленными ограничениями (охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0015 га) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 22 000 руб. 00 коп.** | | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| **Посудная сетка** | Здание нежилое | 60,3 | 602/С-53515 | Блужский с/с, д. Талька, ул. Центральная, 1Г |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0250 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания посудной сетки (срок действия по 04.11.2032) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 13 000 руб. 00 коп.** | | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| **Магазин** | Здание специализированное розничной торговли | 86,4 | 602/С-54171 | Дубровский с/с, д. Синча, ул. Центральная, 50Б |
| Составные части и принадлежности: два сарая, уборная | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,1 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина с установленными ограничениями (охранная зона линий электропередачи до 1000 В, пл. 0,0046 га) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 9 000 руб. 00 коп.** | | | | |
| **Лот №4** | | | | |
| **Магазин** | Здание специализированное розничной торговли | 84,8 | 602/С-54173 | Дубровский с/с/, д. Новый Уборок, ул. Сиреневая, 2А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0184 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина (срок действия по 13.10.2065) с установленными ограничениями (охранная зона ЛЭП напр. до 1000 В, пл. 0,0006 га) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 10 000 руб. 00 коп.** | | | | |
| **Лот №5** | | | | |
| **Магазин** | Здание специализированное розничной торговли | 201,0 | 602/С-54172 | Новоселковский с/с, аг. Горелец, ул. Центральная, 59 |
| Составные части и принадлежности: три пристройки | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,1 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина (срок действия по 13.10.2065) с установленными ограничениями (охранные зоны линий связи и радиофикации, пл. 0,0009 га, и линий электропередачи до 1000 В, пл. 0,0008 га) | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 16 500 руб. 00 коп.** | | | | |
| **Лот №6** | | | | |
